

ШТО ПЕРАШКАДЖАЕ НАШЫМ ГІМНАСТАМ ПЕРАМАГАЦЬ? 3



ФІЛЬМ, ЗНЯТЫ НА... ВІДЭАРЭГІСТРАТАР 6

6 КАСТРЫЧНІКА 2018 г.
СУБОТА
№ 193 (28809)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

# УСЁ ВЫЗНАЧАНА АД ЖЫЦЦЯ

## Прэзідэнту паказалі найноўшыя айчынныя ўзоры ўзбраення і ваеннай тэхнікі

**Нягледзячы на халоднае надвор'е, учора на палігоне ў Івацэвіцкім раёне было горача: пасля даклада аб баявых магчымасцях і асноўных тактыка-тэхнічных характарыстыках зброі беларускаму лідару ўсё паказалі ў справе. Прысутныя назіралі чатыры эпізоды, удзельнікі якіх — беспілотныя лятальныя апараты, авіяцыя, агнявыя комплексы, бранятэхніка і супрацьтанкавыя ракетныя комплексы.**



Фота БелТА.

### МЫ НІКОМУ НЕ ПАГРАЖАЕМ

Яшчэ ў ходзе агляду ўзораў зброі Аляксандр Лукашэнка заявіў: тут сабраліся не для таго, каб каму-небудзь пагражаць або разгарнуць нейкую піяраўшчыну, гэта штодзённае жыццё. Паводле слоў беларускага лідара, мадэрнізуюць айчынныя Узброеныя Сілы ўжо чацвёрты раз, улічваючы сучасныя тэхнічныя сродкі і вопыт канфліктаў у свеце.

На далёкім першым этапе вызначаліся з колькасным саставам арміі — маўляў, для чаго кампактнай краіне было 250—300 тысяч ваенных? Акрамя таго, па словах кіраўніка дзяржавы, першы крок нашай незалежнай суверэннай арміі — рашэнне Прэзідэнта, каб пакінутую ў выніку развалу СССР тэхніку перасталі «рэзаць» і вывозіць. Так разбой быў спынены.

Потым былі ўзброеныя канфлікты ў свеце. У нашай краіне з'явіліся навукова-даследчыя групы, вывучалі вопыт гэтых войнаў. «Стаяла пытанне, як прыстасаваць войска і ўзбраенне да нашых умоў, — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. — Потым былі чарговыя войны. Гэта быў трэці этап. Мы вымушаны былі ствараць сілы спецыяльных аперацый».

«Цяпер мы бачым, што адбываецца недалёка ад нас, што адбываецца ў Сірыі. Вывучаючы сітуацыю, мы ўжо абсалютна разумеем, якой будзе, не дай бог, вайна, як мы павінны абараняцца, якая колькасць нашых Узброеных Сіл павінна быць. Усё вызначана ад жыцця, — сказаў Прэзідэнт. — І мною была пастаўлена задача, каб мы прыступілі да распрацоўкі новых узораў зброі, патрэбных для абароны Беларусі. І паколькі стварэнне новага вельмі затратна і дорага, нам трэба было са старога зрабіць самае сучаснае.

Ён таксама дадаў, што для Беларусі не танкі галоўнае, не самалёты, а спецыяльныя войскі, гатовыя да хуткага рэагавання.

«Мы не збіраемся ваяваць за краем свету. Нам трэба абараніць Беларусь. І пад гэта трэба ствараць самую сучасную армію і адпаведнае ўзбраенне», — канстатаваў Прэзідэнт.

### УМЕЦЬ СТВАРЫЦЬ СВАЁ

Па выніках дэманстрацыі магчымасцяў новага айчыннага ўзбраення кіраўнік дзяржавы пагутарыў з журналістамі.

На пытанне аб тым, наколькі сёння Дзяржаўны ваенна-прамысловы камітэт спраўляецца з ускладзенымі на яго задачамі, Прэзідэнт адзначыў, што незалежнасць у вытворчасці і мадэрнізацыі для любой краіны — пытанне № 1. Беларускі лідар прывёў у прыклад Расійскую Федэрацыю:

«Я часта сустракаюся з Прэзідэнтам Расіі, для яго больш важнай праблемы няма, хоць у іх і так з часоў Савецкага Саюза — Расія асноўная база была вытворчасці нашай зброі, — спадчына засталася немалая, але тым не менш сёетое для сучаснай зброі яны куплялі. Цяпер пытанне № 1 у Расіі — сысці наогул ад імпарту», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка назваў наступную сітуацыю: нават маючы блізкія адносіны з Беларуссю, будуючы адзіную Саюзную дзяржаву, Расія на базе прадпрыемства «КамАЗ» стварае транспарт для перавозкі ядзерных ракет. Ён дадаў, што пытаўся ва Уладзіміра Пуціна: навошта гэта рабіць, калі такі транспарт беларускай вытворчасці пастаўляецца ў Расію. «Ён мне прама кажа: добра, сёння ў Беларусі Лукашэнка, улада і іншае, мы бачым і купляем, але ў перспектыве мы павінны быць абсалютна перакананыя, што асабліва для ядзернай зброі — гэта галоўная зброя ў любой краіне — мы павінны быць незалежныя, — падзяліўся падрабязнасцямі размовы з кіраўніком Расіі беларускі лідар. — Вы разумееце, наколькі сур'ёзна стаіць пытанне незалежнасці ў абароне краіны?».

У сувязі з гэтым, падкрэсліў Прэзідэнт, была пастаўлена задача: пісталеты, аўтаматы, стралковая зброя і боепрыпасы да яе ў Беларусі павінны быць. Ён таксама звярнуў увагу, што гэта неабходна і для таго, каб пры ўзнікненні ваеннай пагрозы можна было кожнаму (даросламу грамадзяніну) выдаць зброю для абароны Радзімы. «Але для гэтага трэба мець сваё. Тое, што можна перадаць мірнаму насельніцтву, якое будзе абараняць сваю краіну. Далей — болей: не будзем жа мы разлічваць на мірнае насельніцтва, якое будзе ваяваць. Гэта ўжо крайні выпадак, не дай бог. Армія павінна быць падрыхтавана, колькасць гэтай арміі павінна быць адпаведнай, і яна павінна мець тую зброю, якая нам трэба. Я прыводзіў прыклад: нам авіяносцы не патрэбныя, нам стратэгічныя бамбардзіроўшчыкі, якія нясуць ядзерную зброю, таксама не патрэбныя. У нас няма ядзернай зброі, мы не збіраемся яе ствараць», — канстатаваў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: Беларусі трэба зброя, якая будзе выкарыстоўвацца выключна для абароны, толькі на нашай тэрыторыі і для нанясення тым, хто нападзе на нашу краіну, непрымальнай шкоды. На яго думку, гэта высокадакладнае ракетнае ўзбраенне з далёкасцю да 300—350 кіламетраў, якое ў Беларусі ёсць. Аднак, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, цяпер паглядзелі на новыя распрацоўкі — беспілотныя лятальныя апараты, а таксама на тое, што можна палепшыць з дапамогай мадэрнізацыі наяўнай тэхнікі.

«У гэтай частцы зроблена нямала, ёсць над чым працаваць, — сказаў ён. — Я бачу, што за гэтыя два гады — нават два не прайшло, калі я паставіў задачу рабіць гэта, — яны зрабілі нямала. І мы сёння адкрыта і шчыра сказалі, што самае галоўнае не тэхніка для нас, яна ў нас добра працуе. Аператары, людзі — іх трэба вучыць, тэхніка нармальная».

На думку беларускага лідара, да зімы гэта цалкам рэальна давесці ўсё да ідэальнай гатоўнасці, а калі будзе час, то такія трэніроўкі варта паўтарыць. Прэзідэнт таксама дадаў, што наўрад ці ў Беларусі будуць актыўна выкарыстоўваць беспілотнікі «Камікадзэ», аднак ёсць дамоўленасць аб стварэнні адзінага цэнтра распрацоўкі такіх прылад, у якім давядуць да розуму апарат, неабходны краіне. А беспілотнікі-разведчыкі ў Беларусі добрыя, дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы зноў падкрэсліў: галоўнае — навучыць людзей, а тэхніка сваю справу ведае, толькі трэба ёй разумна кіраваць. «Выснова галоўная сёння ў тым, што мы на правільным шляху. У гэтым кірунку будзем рухацца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

*Педагагічным работнікам Рэспублікі Беларусь*

**Дарагія сябры!**

**Сардэчна віншую вас з прафесійным святам.**

**Быць настаўнікам — гэта сапраўднае прызванне. Вы з'яўляецеся прыкладам для сваіх выхаванцаў, фарміруеце іх светапогляд і характар.**

**Найвышэйшая ступень педагагічнага майстэрства — не толькі даваць веды, але і выхоўваць маладое пакаленне маральным, працавітым і паспяховым. Прывіваць нашым дзецям любоў да Радзімы, шанаванне духоўнай спадчыны свайго народа, імкненне развівацца і ўдасканальвацца. Знаходзячыся ў авангардзе грамадска-палітычнага жыцця краіны, быць надзейнымі партнёрамі дзяржавы ў пабудове будучыні Беларусі.**

**Выказваю вам удзячнасць за штодзённую працу — адну з самых важных і высакародных на Зямлі, найвялікшую адданасць прафесіі, бясконцую мудрасць і велізарную цярплівасць.**

**Жадаю моцнага здароўя, шчасця і невычэрпнай энергіі!**

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Вялікі перапынак

# «КАЛІ ВУЧАНЬ СПРАЧАЕЦЦА — ГЭТА СУПЕР!»

## Малады педагог — пра сакрэты паспяховага ўрока, выхаваўчую сілу гісторыі і крытычнае мысленне




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**«За 6 мільёнаў кажа адзін голас — не мудраца, не паэта — звычайнай дзяўчынкі...» Гэтыя словы пісьменніка Ільі Эрэнбурга, прысвечаныя «Дзённіку Ганны Франк», сталі эпіграфам да ўрока па сусветнай гісторыі ў 10-м класе сталічнай гімназіі № 34. Што паспрыяла прыходу ў Германіі нацыстаў да ўлады? Што адбывалася падчас «Хрустальнай ночы»? Які ўрок даў сваім вучням вядомы польскі педагог, пісьменнік, урач і грамадскі дзеяч Януш Корчак? Вучні шукаюць адказы на гэтыя пытанні пад кіраўніцтвам сваёй маладой настаўніцы Дар'і Алегаўны КАСЯКОВАЙ.**

### ЯК АДНО ІМГНЕННЕ

Абсалютна відавочна, што яе ўрокі мала падобныя на традыцыйныя. Тэма Халакосту — няпростая для сучасных дзяцей, бо размова ідзе пра падзеі амаль 80-гадовай даўнасці. Як дастукацца да іх душы? На ўроку ў Дар'і Касяковай вучні чытаюць цытаты з дзённіка яўрэйскай дзяўчынкі, якая падчас нацысцкай акупацыі хавалася разам са сваёй сям'ёй у Амстэрдаме. Дзённік пасля вайны стаў самым гучным абвінаваўчым актам нацызму. Старшакласнікі спрабуюць разабрацца, што стаіць за тым ці іншым запісам, якія падзеі ў гэты час маглі разгортвацца, што адбывалася з роднымі дзяўчынкі, з ёй самой? Дзецям дэманструюць дакументальную хроніку, затым ім раздаюць карткі з назвамі лагераў, якія знаходзіліся на тэрыторыі Еўропы: канцэнтрацыйныя, працоўныя, лагеры смерці... За дзве хвіліны яны павінны знайсці ў інтэрнэце інфармацыю пра іх і лакалізаваць на карце. Затым дзесяцікласнікі глядзяць кароткаметражны фільм рэжысёра Энтані Грына «Голуб», які зразумелы нават без перакладу. Перад праглядам ім прапануецца стоп-кадр з выявамі галоўных герояў: яны павінны выказаць сваё меркаванне, хто з іх, хутчэй за ўсё, акажацца агрэсарам, ахвярай і сведкам. Фільм прысвечаны рэальным падзеям і знаходзіцца ў рэчышчы разглядаемай тэмы. Напрыканцы высвятляецца, што стэрэатыпы, якімі мы кіруемся, не дзейнічаюць, і ўсе выказаныя здагадкі аказаліся няправільнымі. Старшакласнікі шукаюць тлумачэнні матывам паводзінаў герояў фільма. У канцы ўрока ім раздаюць далонькі, падобныя на сімвал міру — галубоў: на іх навучэнцы павінны падзяліцца сваімі думкамі, якім жа павінен быць сапраўдны чалавек. Думкі дзяцей займаюць потым месца на дошцы пад словамі Ільі Эрэнбурга пра Ганну Франк. А ў якасці дамашняй работы навучэнцы атрымліваюць заданне — даведацца пра лёс адной з ахвяр Халакосту. Па ўласным выбары...

СТАР. 2

Парламенцкі дзённік

# ДЭПУТАТЫ ЗАЦВЕРДЗІЛІ КАНДЫДАТУРУ ПРЭМ'ЕРА

**Учора падчас пасяджэння Палаты прадстаўнікоў было разгледжана пытанне аб згодзе на назначэнне Сяргея Румаса прэм'ер-міністрам.**

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА** прадстаўляла прэм'ер-міністра. Яна падкрэсліла, што фарміраванне эфектыўнага дзяржаўнага апарату, здольнага забяспечыць устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны, з'яўляецца адным з прыярытэтаў кадравай палітыкі. Ён павінен хутка рэагаваць на выклікі і пагрозы сучаснага свету, аб'ектыўна прымаць рашэнні ў інтарэсах людзей і несці адказнасць перад народам. «Менавіта зыходзячы з гэтых строгіх патрабаванняў, кіраўніком дзяржавы былі прыняты рашэнні аб ратацыі ўрада, у тым ліку ўключаючы яго найвышэйшы эшалон», — адзначыла Наталля Качанава.

Гаворачы пра Сяргея Румаса, кіраўнік Адміністрацыі падкрэсліла, што гэта не новы чалавек ва ўрадзе. У 2010—2012 гадах ён займаў пасаду намесніка прэм'ер-міністра, курыраваў эканоміку і фінансы. Мае вучоную ступень кандыдата эканамічных навук. Апошнім часам Сяргей Румас узначальваў Банк развіцця, займаўся пытаннямі падтрымкі экспарту, развіцця прадпрымальніцтва і прыцягнення замежных інвестыцый, актыўна ўдзельнічаў у распрацоўцы дакументаў аб стварэнні ЕАЭС.

«Задачы, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы перад новым складам Савета Міністраў, вядомыя. Новаму прэм'ер-міністру і ўсяму ўраду давядзецца забяспечыць збалансаванае развіццё краіны і рэгіёнаў, рост дабрабыту грамадзян. Адным з першачарговых пытанняў з'яўляецца якасная падрыхтоўка прагнозных дакументаў на 2019 год і наступныя гады, у тым ліку пры канструктыўным узаемадзеянні з парламентарыямі», — адзначыла Наталля Качанава.

Па выніках тайнага галасавання дэпутаты Палаты прадстаўнікоў назначэнне Сяргея Румаса кіраўніком урада адобрылі.

Сяргей Румас выступіў перад парламентарыямі і адказаў на іх пытанні.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

ISSN 1990 - 763X
18193>
9 771990 763008

КОРАТКА

- **Прафсаюзная акцыя «Павіншуем маму разам!» пройдзе ў краіне з 8 да 12 кастрычніка.**
- У Беларусі ў сярэднім спажываюць 10 грамаў солі ў суткі, у той час як СААЗ для захавання здароўя рэкамендуе норму да 5 грамаў.
- **У Мінскай вобласці падчас масавай вакцынацыі плануецца прышчапіць ад грыпу больш за 540 тысяч чалавек.**
- У Брэсцкай вобласці ў Маларыцкім раёне ўпершыню выяўлены залацісты баравік. Для Беларусі гэта новы грыб, шырока распаўсюджаны ён у лясах ЗША і Канады.
- **Футбалісты барысаўскага БАТЭ прайгралі грэчаскаму ПАОКу з лікам 1:4 у дамашнім матчы Лігі Еўропы.**



# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Нобелеўская прэмія міру — 2018 прысуджана хірургу Дзянісу Муквега і праваабаронцы Надзі Мурад

Аб гэтым паведамляецца ў афіцыйным Twitter-акаўнце прэміі.

Прэстыжная прэмія прысуджана за іх намаганні па спыненні выкарыстання сексуальнага насілля ў якасці зброі вайны і ўзброеных канфліктаў.



Летась Нобелеўскай прэміі міру была ўдастоена «Міжнародная кампанія за ліквідацыю ядзернай зброі» (International Campaign to Abolish Nuclear Weapons: ICAN) «за работу па прыцягненні ўвагі да катастрафічных гуманітарных наступстваў любога прымянення ядзернай зброі і наватарскія намаганні для дасягнення забароны такой зброі на аснове дагавораў».

### Кітай устанавіў стандарты дыягностыкі інтэрнэт-залежнасці ў падлеткаў

У Кітаі выпушчана кіраўніцтва па санітарнай адукацыі падлеткаў, у якім удакладняецца азначэнне паняцця «інтэрнэт-залежнасць» і ўстанаўліваюцца стандарты дыягностыкі гэтага віду залежнасці.

«Інтэрнэт-залежнасць праяўляецца ў некантралюемым выкарыстанні інтэрнэту без уздзеяння якіх-небудзь рэчываў, якія выклікаюць прывыканне», — гаворыцца ў дакуменце, апублікаваным Дзяржаўным камітэтам па справах аховы здароўя.



Сімптомы інтэрнэт-залежнасці ўключаюць у сябе парушэнні ў вучэбнай, прафесійнай і сацыяльнай сферах жыцця чалавека пад уплывам празмернага выкарыстання інтэрнэту. Галоўным крытэрыем для дыягнаставання такога парушэння з'яўляецца працягласць праявы залежнасці, сімптомы якой павінны прысутнічаць на працягу як мінімум 12 месяцаў.

«Лічбы паказваюць, што доля падлеткаў, якія дэманструюць празмерную залежнасць ад інтэрнэту, у свеце дасягнула 6 %, а ў Кітаі яна ўжо набліжаецца да 10 %, — паведаміў Лу Лін, акадэмік Акадэміі навук Кітая і галоўны ўрач бальніцы пры Пекінскім універсітэце. — Паколькі інтэрнэт-залежнасць звязана з іншымі псіхалагічнымі праблемамі, такімі як трывожнасць і дэпрэсія, яе лячэнне павінна спалучацца з правіламі, накіраванымі на вырашэнне згаданых праблем».

### Былы прэзідэнт Рэспублікі Карэя прысуджаны да 15 гадоў турмы

Суд горада Сеул прысудзіў былога прэзідэнта Рэспублікі Карэя Лі Мён Бака, які абвінавачваўся ў карупцыі і злоўжыванні ўладай, да 15 гадоў турмы і штрафу ў 13 млрд карэйскіх вон ($11,5 млн).

У красавіку 2018 года пракуратура Рэспублікі Карэя абвінаваціла 76-гадовага экс-прэзідэнта ў хабарніцтве, прысваенні сродкаў, злоўжыванні ўладай і запрасіла для яго 20 гадоў калоніі. Былы прэзідэнт не прысутнічаў на слуханні ў знак пратэсту супраць прамога тэлевяшчання са слуханняў. Лі Мён Бак, які знаходзіўся ва ўладзе з 2008 да 2013 года, стаў чацвёртым паўднёвакарэйскім экс-прэзідэнтам — фігурантам крымінальнай справы.

# УСЁ ВЫЗНАЧАНА АД ЖЫЦЦЯ

### СЛУЖБА Ў АРМІІ МУЖЧЫНУ ПАТРЭБНА

Другое пытанне таксама датычылася ваеннай справы: у Аляксандра Лукашэнкі спыталі, як адрадзіць былы прэстыж службы ў арміі. Па словах кіраўніка дзяржавы, ён некалькі рэзка выказваецца на гэтую тэму, паколькі гэта яго як мужчыну — не толькі як Прэзідэнта, занадта чапляе. Беларускі лідар прывёў лічбу: амаль 80 % мужчын, якія трапляюць пад прызыў, атрымліваюць адтэрміноўкі. Прычыны розныя, аднак вынік адзін: значную колькасць ваеннаабавязаных не прызываюць.

«Гэта нармальна? Гэта ненармальна. Ведаеце, мы выміраем як клас, мы выміраем як мужыкі. Якой жанчыне патрэбны мужык, які не служыў? — задаўся пытаннем Прэзідэнт. — Вось я кажу: не дай бог, вайна, раздадзім зброю. Што яму зброю даваць, калі ён не ўмее ёй карыстацца? Таму вельмі сур'ёзна — гэта наша задача — на працягу гэтага года і наступнага паўгоддзя падумаем над тым, як зрабіць так, каб навучыць мужыка абараніць хоць бы сябе, сям'ю, не кажучы ўжо пра тое, што ён павінен радзіму абараняць».

Акрамя таго, сёння сітуацыя складваецца такім чынам, што прэстыж арміі значна пагаршаецца з-за асобных інцыдэнтаў, у сувязі з чым людзі пачынаюць асцерагаюцца. Прэзідэнт падкрэсліў: у нас добрая армія, не без рознага роду праблем, як у Печах, аднак падобнае было ва ўсе часы.

Беларускі лідар канстатаваў, што так не бывае, калі армія ваюе, удзельнічае ў вучэннях, а людзі не гінуць. У прыклад ён прывёў вучэнні ў Савецкім Саюзе, калі ў канцы 80-х гадоў загінула больш за 20 чалавек, хоць вучэнні былі вельмі перадавымі.

«Я гэта да чаго: нам яшчэ маліцца трэба, што бог нас беражэ, што мы ў арміі не нясем такіх страт, нават у мірны час. Але гэта не апраўданне падзеям у Печах», — адзначыў Прэзідэнт.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на адзінкавыя выпадкі дзедаўшчыны. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у яго ад гэтага ўсё ўнутры пераварочваецца, паколькі падчас яго ўласнай службы такое было непрымальна. Ён падкрэсліў: калі ёсць дзедаўшчына, калі здзекуюцца з людзей, гэта ганьба арміі і гэта будзе выпальвацца гарачым жалезам.

«Не дай бог, калі гіне чалавек, не дай бог. Гэта ж ты яго гадаваў, а ён загінуў. Але на жаль, бывае ўсякае. І тое, што нам удалося зберагчы сваіх хлопцаў, сваіх вайскоўцаў, сваю краіну ад гэтых войнаў, трымаць на мінімуме гэтыя праблемы — гэта вялікае дасягненне», — сказаў беларускі лідар.

Ён адзначыў, што ўтойваць нічога не трэба, але лішні шум падымаць не варта, у сувязі з чым народ служыць не хоча, а хтосьці і баіцца. «Не трэба баяцца гэтага. Мы ад гэтага нікуды не сыдзем, наша такая доля, асабліва мужыкоў, Радзіму абараняць», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

### АД ГВАЛТУ ДА АЛКАГОЛЮ

Трэцяе пытанне датычылася законапраекта, прысвечанага супрацьдзеянню хатняму гвалту. Дакумент стаў даволі абмяркоўваемы ў грамадстве: у прыватнасці, у ім ёсць паняцце «эканамічны гвалт» (напрыклад, не даў дзіцяці грошай на кішэнныя выдаткі) ці сітуацыя, калі сужэнцы называюць сябе «партнёры», а не «муж і жонка».

Аляксандр Лукашэнка ёміста выказаўся з нагоды праекта закона — «бязглуздзіца поўная». «Гэта той выпадак, калі ў нас даручаюць распрацоўку праектаў законаў не тым, каму трэба. Я правяду паралель: зусім нядаўна мне давялося адмяніць вядомае рашэнне па продажы ноччу лікёра-гарэлачных вырабаў», — нагадаў ён. Беларускі лідар растлумачыў, што адбылося: ён пачаў разбірацца, хоць яму нават не паведамілі, што такое рашэнне прынята, раней кіраўнік дзяржавы катэгарычна забараніў падымаць гэтую тэму без яго ведама.

Раней гэта ўжо ўсё праходзілі: Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб камсамольскіх вяселлях, калі на ўрачыстасці алкаголь разлівалі з чайнікаў, хоць былі прыняты адпаведныя законы.

«Скажыце, хто з нас не змог бы купіць у любы час ночы спіртное? Па званку, насілі, вазілі б, і тыя прадаўцы, якія ў крамах не павінны прадаваць, яны б адчынялі крамы і раздавалі гэтыя бутэлькі», — сказаў Прэзідэнт. Ён паставіў пытанне: няўжо нам гэта трэба — каб таксісты з багажнікаў па начах прадавалі спіртное?

І справа тут не ў бюджэце, хоць гэта таксама важна, сказаў Прэзідэнт. Гэтая тэма таксама закраналася ў размове з Уладзімірам Пуціным. Прэзідэнт Расіі расказаў, што беларускі алкаголь і цыгарэты карыстаюцца папулярнасцю на тэрыторыі яго краіны, аднак гэта адбываецца не з-за таннасці ўвозу і продажаў. Расіяне самі фурамі возяць гэтую прадукцыю з-за яе якасці, прыязджаюць у прыгранічныя гарады і купляюць.

Што датычыцца разбору сітуацыі з забаронай на продаж алкаголю, то Прэзідэнт адзначыў: міліцыя звярнулася ва ўрад, а ён рэкамендаваў правесці эксперымент. «Слухайце, які эксперымент? Эксперымент праводзяць, калі не ведаюць, што будзе на выхадзе, каб паспрабаваць, але мы ж ужо гэта спаўна паспрабавалі. Які эксперымент? Гэта бязглуздае рашэнне ўрада ў выглядзе эксперымента, ну, напэўна, каб дагадзіць міліцыі і гэтак далей. На што я папярэдзіў міліцыю», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік дзяржавы іранічна прапанаваў у такім выпадку забараніць ездзіць на аўтамабілях, бо на дарогах гіне значная колькасць людзей. Відавочна, што — гэта іронія, вырашаць праблему трэба інакш.

Беларускі лідар падкрэсліў: распрацоўка законапраектаў — не справа міліцыі, яны могуць дапамагчы, параіць і пракансультаваць. Аднак гэтым павінны займацца профільныя органы, грамадскасць, урад, Адміністрацыя Прэзідэнта і іншыя.

Гэта датычыцца любога законапраекта — яго прыняцце залежыць толькі ад інтарэсаў народа і дзяржавы. Узяць хатні гвалт: паводзіны бацькоў «без цара ў галаве» ніякімі законамі не адрэгулюеш. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: бачыш, што дзіцяці і блізка не трэба грошы паказваць, то не паказвай. Што да фізічнага ўздзеяння на дзяцей, то, паводле яго слоў, часам для некаторых можна дазволіць пляснуць рукой або нават рэменем. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: ён не прыхільнік таго, каб караць дзяцей, і падзяліўся ўласным досведам выхавання сыноў. Віктар, старэйшы сын, часам атрымліваў, а вось Мікалай, малодшы, — ніколі. «Ён гэтага не заслугоўвае, — сказаў беларускі лідар. — А сярэдні, Дзіма, ён ужо бачыў, як Віцю даставалася за справу, ён роўненька стаяў побач і ўжо не шкодзіў». Прэзідэнт сказаў, што магчымыя змены ў існуючыя дакументы, дырэктывы па супрацьдзеянні хатняму гвалту.

### ДАПАМАГАЦЬ ТЫМ, ХТО МАЕ ПАТРЭБУ

Апошняе пытанне было прымеркавана да Дня настаўніка: якіх прынцыпаў выхавання прытрымліваецца Прэзідэнт як бацька школьніка?

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пры выхаванні як атрымаецца: калі дзіця не разумее, то бацька можа жорстка сказаць. «Я ўсё ж такі Прэзідэнт, таму, напэўна, і дзеці ўлічваюць, што бацьку лепш не хваляваць, і калі ён так кажа — гэта ўжо закон. Таму я не ўзор у выхаванні дзяцей і не прыклад для пераймання. Ды і дзеці разумеюць, што бацьку падвесці нельга. Я вельмі рады, што яны не сталі залатой моладдзю, як модна цяпер казаць», — дадаў ён.

Паводле слоў беларускага лідара, напярэдадні навучальнага года старэйшыя сыны дапамагаюць навучальным установам, а малодшы сын дапамог некальком дзясяткам дзяцей у набыцці школьных прылад і адзення. «Сабралі тое, што ён за лета зарабіў, старэйшыя яму крыху далі, я два месячныя аклады ў гэтую касу паклаў, мае хатнія патрошку сабралі — і пяцідзесяці чалавекам у школе аказалі дапамогу. Гэта яго выхаванне: калі ў цябе ёсць — дапамажы таму, хто мае патрэбу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ кіраўнік дзяржавы выказаў меркаванне, што дзіця павінна не толькі добра вучыцца, але і мець захапленні, — няхай гэта будзе спорт, музыка або іншае мастацтва.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Выстава

# УСЯ ГІСТОРЫЯ НА ФОТА

## У Палацы Незалежнасці адкрылася выстаўка «Спадчына Беларусі. Адноўленыя архітэктурныя каштоўнасці»

**Фотапраект Аляксандра Аляксеева і Алега Лукашэвіча бачылі як мінчане на агароджы парку Чалюскінцаў, так і жыхары еўрапейскіх гарадоў. Пакалясіўшы па свеце, ён з'явіўся і ў Палацы Незалежнасці, каб яго госці маглі ацаніць усю прыгажосць айчыннай архітэктуры.**

Падчас выстаўкі было прадстаўлена 18-е перавыданне кнігі-альбома «Спадчына Беларусі». За апошнія 14 гадоў ужо выйшла 46 500 яе паасобнікаў, што з'яўляецца рэкордам для нацыянальнага кнігавыдання сярод аналагічнай прадукцыі. Старажытныя храмы, палацы, замкі і сядзібы хаваюцца за вокладкай. Яны прадстаўляюць чытачу — а лепш сказаць гледачу — усю палітру архітэктурна-гістарычнай спадчыны. Дарэчы, гэта кніга прадстаўлена ў фондах найбуйнейшых бібліятэк свету, у прэстыжных універсітэтах, культурных і дыпламатычных установах. Яе маюць і вядомыя прыватныя калекцыянеры, сярод якіх каралева Вялікабрытаніі і Папа Рымскі.

На думку Алега Лукашэвіча, праект паказвае, наколькі велізарны крок зрабіла краіна за гады сваёй незалежнасці. Аўтар каментуе, што, напрыклад, яшчэ 15 гадоў таму Мірскі замак быў зусім у іншым стане. А зараз ён адноўлены, як і шэраг іншых будынкаў.

Аляксандр Аляксееў тлумачыць, што тэму спадчыны абралі нездарма. Прырода ўсюды прыгожая, у кожнай краіне. А людзей цікавіць самабытнасць нацыі, што яна стварае. Гэта відаць праз помнікі архітэктуры: магчыма ацаніць узровень навукі, культуры, замежных сувязяў. «Не ў кожнага ёсць час паехаць па Беларусі, а вось так хоць будзе прыадкрывацца наша спадчына», — лічаць аўтары праектаў, бо многія будынкі размешчаны ў рэгіёнах. Алег і Аляксандр адзначаюць, што акцэнт быў зроблены на мастацкае прадстаўленне нашай гісторыі і культуры. Аднак у аснове праекта ўсё ж такі ляжыць вялікая навукова-даследчая праца. Дапамагалі супрацоўнікі музеяў, архівы, гістарычная літаратура. Аўтары вывучалі гісторыю гэтых помнікаў і абіралі самае цікавае, што можа зачапіць і нацыянальнага, і замежнага гледача.

Адкрыццё выстаўкі наведалі міністры, дыпламаты і іншыя дзяржаўныя служачыя. Міністр культуры Беларусі Юрый Бондар адзначыў, што месца правядзення выстаўкі падкрэслівае тую ўвагу, якую ўдзяляе дзяржава пытанням захавання гісторыка-культурнай спадчыны. «Нам ёсць чым ганарыцца, таму што за 27 гадоў незалежнасці была прароблена каласальная праца. Мы гаворым заўсёды пра замкі ў Нясвіжы і Міры — гэта культурныя сімвалы Беларусі. Але ў той жа час сотні аб'ектаў прыведзены ў належны стан. І ў цяперашні час, калі нават разгледзець інвестыцыйную праграму ўрада, па якой забяспечана фінансаванне, рэстаўрацыйныя работы вядуцца на васьмі аб'ектах. Аб апошніх нашых работах вы можаце меркаваць, пабываўшы ў Косаве, Пружанах, сядзібе ў Свяцку...», — тлумачыць Юрый Бондар.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# «Архівы — своеасаблівая машына часу...»

## У Мінску абмеркавалі перспектывы развіцця архіўнай справы ва ўмовах лічбавізацыі

**Як даведацца пра сваё паходжанне? Дзе знайсці біяграфічныя звесткі пра тую ці іншую знакамітую асобу? Ці можна паглядзець накіды знакамітых мастакоў? Адказы на гэтыя пытанні дапамогуць знайсці ў архівах. Сёння ў краіне адзначаецца дзень архівіста. З гэтай нагоды прадстаўнікі прафесіі абмеркавалі перспектывы развіцця сваёй справы.**

— Перш за ўсё, што хацелася б адзначыць, — немагчыма ведаць гісторыю краіны, гісторыю і паходжанне свайго ўласнага роду без архіваў, — сцвярджае **першы намеснік дырэктара Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Беларусі Вольга БІРУКОВА.** — Таму што менавіта архівы могуць даць дакладную і правераную інфармацыю наконт усяго, што адбывалася на нашай зямлі на працягу многіх стагоддзяў. З кожным годам цікавасць да гісторыі ўзрастае. За дзесяць гадоў колькасць наведвальнікаў нашых архіваў павялічылася ўдвая.

Калі выстраіць усе паліцы з архіўнымі дакументамі ў адзін рад, даўжыня яго складзе больш за 200 кіламетраў. Беларускія архівы змяшчаюць больш за 13 мільёнаў дакументаў на друкаванай аснове, а таксама — фотаздымкі, кінастужкі, відэаматэрыялы, музычныя дакументы і іншае.

— Сёння адной з галоўных задач айчынных архівістаў з'яўляецца перавод дакументаў у электронны варыянт, — расказвае Вольга Уладзіміраўна. — Зараз ідзе работа па падрыхтоўцы нарматыўнага прававога акта, які будзе рэгламентаваць дзейнасць архіваў электронных дакументаў. Але гэта не значыць, што друкаваныя прападуць. Яны захаваюцца, але наведвальнікі будуць карыстацца электроннымі варыянтамі.

Дарэчы, гістарычныя дакументы Беларусі змяшчаюцца ў шасці рэспубліканскіх, дзевяці абласных і шаснаццаці занальных дзяржаўных архівах. Сёлета ўведзены ў строй новы будынак занальнага архіва ў Слуцку.

**Алена КУШНОВА, намеснік дырэктара Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь,** расказала, што яны праводзяць выстаўкі, прысвечаныя памятным датам. Цэнтральнай сёлета стала выстаўка да 100-годдзя з дня нараджэння Пятра Машэрава.

Падобныя выстаўкі ладзяць і ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва.

— Адкрылася выстаўка «Сцежкамі жыцця Паўліны Мядзёлкі», — расказвае **дырэктар Ганна ЗАПАРТЫКА.** — Яна дае ўяўленне аб творчым шляху беларускай культурнай дзеячкі. Хоць наш архіў-музей і не з'яўляецца традыцыйным музеем, але ў перспектыве можа ім стаць. Бо ў нас захоўваюцца архіўныя звесткі аб цікавых гісторыях з жыцця беларускіх пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў і іншых. Дзе яшчэ можна паглядзець на арыгіналы рукапісу таго ці іншага пісьменніка? Толькі ў нас.

**Маргарыта ГАЙДАРЖЫ.**

# «КАЛІ ВУЧАНЬ СПРАЧАЕЦЦА — ГЭТА СУПЕР!»



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Смартфон на ўроку — зусім не вораг, а памочнік.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Якім павінен быць урок, каб ён прынёс задавальненне і настаўніку, і вучню? Па-першае, дынамічным, каб ні педагогу, ні дзецям не было сумна. Калі 45 хвілін праляцелі як адно імгненне — гэта для мяне вельмі важны паказчык, — разважае Дар'я Алегаўна. — У маладых настаўнікаў часта ўзнікаюць праблемы з дысцыплінай у класе, бо ўтрымаць увагу 20—25 вучняў, не маючы яшчэ пэўнага прафесійнага досведу, даволі складана. Крычаць на дзяцей бессэнсоўна — так аўтарытэт ты сабе не заробіш. А вось калі ўрок праходзіць у актыўным тэмпе, калі не ўзнікае аніякіх паўзаў, абсалютна ўсе ў класе ўцягнуты ў пошукі і дыялог, вось тады такіх складанасцяў не ўзнікае. Дваццаціхвілінны маналог настаўніка нікога і ніколі не зацікавіць. Да таго ж мы маем справу з пакаленнем візуалаў, таму трэба задзейнічаць і гукавы, і зрокавы рэсурсы.

Для мяне таксама **вельмі важна паказваць сувязь гісторыі, якую мы вывучаем, з сённяшнім днём.** Нават калі не атрымліваецца знайсці прамую сувязь з сабой, можна паспрабаваць уявіць сябе чалавекам той эпохі, які знаходзіцца ў канкрэтных умовах. Чаму нацысты так рабілі і чаму ім дазволілі так рабіць? Што адчувалі іх ахвяры? На ўроку абавязкова павінна быць месца эмпатыі — суперажыванню эмацыянальнаму стану іншага чалавека. Гісторыі я аддаю, у першую чаргу, выхаваўчую функцыю. Магчыма, мае вучні не ведаюць на памяць усе даты, затое яны разумеюць логіку падзей. Галоўнае ж пытанне, не што, дзе і калі адбылося, а чаму адбылося? Пры спробе даць усё вучні, насамрэч, не атрымліваюць нічога. А для таго каб у іх галаве насамрэч штосьці засталося, трэба не завучыць даты і паняцці, а зразумець гістарычны працэс. Людзі ж заўсёды кіруюцца аднымі і тымі ж прынцыпамі і матывамі. Таму калі зразумееш логіку аднаго гістарычнага працэсу, зможаш затым спраецыраваць свае веды і на іншы гістарычны працэс. Пры вывучэнні гісторыі трэба рухацца ад асобы да глабальных падзей. Вялікую падзею неабходна вывучаць праз лёс канкрэтнага чалавека. Кожнага, найперш, цікавіць гісторыя сваёй сям'і, свайго роду, сваёй краіны, а потым ужо свету, а не наадварот.

**Калі вучань на ўроку спрачаецца са мной — гэта проста супер! Дыскусія — мара любога настаўніка гісторыі! Дыскутаваць магчыма, толькі калі ты вельмі добра падрыхтаваны і свабодна арыентуешся ў тэме. І калі такое адбываецца — для мяне гэта сапраўдная ўзнагарода.**

### НЕ ДАВЯРАЦЬ, А ПРАВЯРАЦЬ!

Бягучы навучальны год у прафесійнай кар'еры Дар'і ўжо шосты. Яшчэ будучы студэнткай Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка дзяўчына прыйшла ў 34-ю сталічную гімназію і стала працаваць тут на палову стаўкі, а потым сюды ж і размеркавалася. Сёння яна выкладае гісторыю амаль ва ўсіх класах: з шостага да адзінаццатага. Плюс у яе ёсць класнае кіраўніцтва, яна вядзе факультатыў па падрыхтоўцы да алімпіяды. Гэта вельмі сур'ёзная нагрузка ў плане падрыхтоўкі. Прызнаецца, што для таго каб распрацаваць цікавы ўрок, патрабуецца да дзвюх гадзін. Канешне, цяпер у яе ўжо ёсць пэўны банк цікавых тэкстаў, думак, выказванняў, плакатаў, карыкатур, фатаграфій, фільмаў і г. д., да якога яна прыбягае пры падрыхтоўцы, што крыху спрашчае задачу. Галоўнае правіла — твой урок павінен быць цікавы не толькі табе, а найперш, тваім вучням.

— Захапляльна, пазнавальна, карысна — менавіта такая паслядоўнасць павінна вытрымлівацца. Бо калі не будзе захапляльна, то не будзе ні пазнавальна, ні карысна, — падкрэслівае педагог. — Гісторыя развівае крытычнае мысленне адназначна.

Так, гісторыю шмат разоў перапісвалі, таму я тлумачу сваім вучням, што трэба крытычна ставіцца да таго, што ты чытаеш. Крыніц інфармацыі ці меркаванняў, паглядаў на тую ці іншую падзею павінна быць як мінімум дзве. Ні падручнік, ні тэлебачанне, ні газета, ні меркаванне настаўніка не з'яўляюцца адзінай крыніцай інфармацыі, тым больш абавязкова праўдзівай. І калі мы штосьці абмяркоўваем, то я заўсёды выслухоўваю меркаванні вучняў і, толькі калі трэба, агучваю сваю думку. На жаль, але гісторыя нікога не вучыць, і ніхто не выносіць з яе ўрокаў. Таму добра, калі ты хоць бы на імгненне задумаўся...

### ПРАВІЛЫ, АГУЛЬНЫЯ ДЛЯ ЎСІХ

Настаўніца ўпэўнена, што смартфон на ўроку — зусім не вораг, а памочнік. Забараняць гаджэты сучасным дзецям абсалютна бессэнсоўна, лепш паставіць іх на службу сабе.

— У нашай гімназіі створаны ўмовы, якія проста грэх не выкарыстоўваць. Дзякуючы нашым шэфам — РУП «Белтэлекам» — ва ўсёй навучальнай установе ёсць Wi-Fi. І ў маім кабінеце ёсць усе тэхнічныя магчымасці для правядзення сучасных урокаў. А смартфоны дазваляюць мне вырашыць праблему раздрукоўкі матэрыялаў. Да таго ж дапамагаюць вучням знайсці ці праверыць тую ці іншую інфармацыю, — дзеліцца сваімі сакрэтамі педагог. — Канешне, за дзве хвіліны, як гэта было сёння, праверыць крыніцу інфармацыі немагчыма. Калі мы ўжо паглыбляемся ў пэўнае пытанне, то гэта як мінімум аднімае 20 хвілін урока. Старэйшым дзецям можна даць заданне на дом, а на ўроку ўжо адбываецца толькі абмеркаванне. Але абавязкова павінны быць устаноўлены агульныя правілы для ўсіх: калі ў настаўніка на ўроку раздаецца тэлефонны званок, і ён на яго адказвае, то не мае права патрабаваць ад дзяцей прытрымлівацца правілаў. Увогуле настаўнік — прыклад для вучняў ва ўсім. Калі я дазволю сабе знізіць планку і правесці звычайны ўрок, мне тут жа дадуць гэта зразумець. І на наступны ўрок прыйдуць дрэнна падрыхтаваныя.

У Дашы таксама былі настаўнікі, якія сталі для яе прыкладам і захапілі сваім прадметам. Дзесяць класаў яна заканчвала ў фізіка-матэматычным класе 46-й мінскай школы. Гісторыю ў яе выкладала дырэктар Ніна Міхайлаўна Каршунова (зараз яна працуе ў Мінскім гарадскім інстытуце развіцця адукацыі). Але ў 11-м класе Даша паступіла ў ліцэй № 2 на грамадазнаўчы профіль. Там запалены агеньчык падтрымаў выдатны настаўнік гісторыі Фёдар Васілевіч Радыёнаў, а ў педагагічным універсітэце — Аляксандр Аляксандравіч Карзюк.

— Універсітэцкі выкладчык забяспечыў мне ўпэўнены старт, — канстатуе дзяўчына. — Дзякуючы яго заняткам і асабістаму прыкладу я дакладна ведала, што і як трэба зрабіць, каб урок атрымаўся, і ўпэўнена заходзіла ў клас яшчэ на пачатку свайго прафесійнага шляху. Я заўсёды была выдатніцай і ліцэй скончыла з сярэбраным медалём, а калі паступіла ў педуніверсітэт, то, сустракаючы знаёмых, нярэдка чула: «Напэўна, дрэнна здала ЦТ?» Ад адной сваёй былой настаўніцы пачула: «Даша, ты ж была такая разумная таленавітая дзяўчынка, што здарылася?» Ды і бацькі разлічвалі, што я з улікам свайго матэматычнага складу розуму выберу больш прыбытковую прафесію. Цяпер мною ганарацца, асабліва радуецца маіх поспехам бабуля. Я першая ў нашай сям'і, хто атрымаў вышэйшую адукацыю. А мае матэматычныя мазгі мне вельмі ў жыцці дапамагаюць *(усміхаецца. —* **Аўт.**) Я сваім прыкладам спрабую разбурыць стэрэатып, што настаўніца — гэта гаротная загнаная жанчына, хачу даказаць, што на любым месцы можна быць паспяховым і табе будуць зайздросціць.

### НОВАЯ ВЯРШЫНЯ І ВЫКЛІК

— Па прыродзе я канкурэнтны чалавек — вельмі люблю ўдзельнічаць у розных конкурсах. Калі мяне туды накіроўваюць, значыць, я прафесіянал у сваёй справе. Люблю публічнасць. Вось пісаць тэксты не люблю — лепш 50 разоў выступлю, — прызнаецца Дар'я. — Ніколі нікому не адмаўляю ў прафесійнай просьбе і згаджаюся на самыя розныя прапановы, усё новае — заўсёды цікава.

З гэтага года яшчэ і выкладаю ў педагагічным універсітэце — прапанавалі, і я, вядома, пагадзілася. Таксама вырашыла, што буду не толькі вучыць студэнтаў, але і вучыцца сама, таму паступіла ў завочную магістратуру. Мне вельмі цікава камунікаваць і з малодшымі школьнікамі, і са старэйшымі, і са студэнтамі. Да ўсіх трэба шукаць свой падыход, яны вельмі розныя, з рознымі адукацыйнымі запытамі. У малодшых дзяцей яшчэ вочы гараць! А са старэйшымі цікава дыскутаваць. Гэта адно з тлумачэнняў, чаму ў мяне такая нагрузка ў школе, — я проста не магу адмовіцца ад сваіх вучняў. Па якім прынцыпе выбраць клас, які перададуць іншаму настаўніку? Да таго ж такі крок дзеці расцэняць як здраду. А яшчэ ўпэўнена, што **калі ты адмаўляешся ад чагосьці ў 25 гадоў, то ў 35 гадоў табе гэта ўжо не прапануюць. Таму нельга ўпускаць свае магчымасці. Выкладчыцкая праца — новая вяршыня і новы выклік для мяне. Пакуль запатрабаваная, я жыву і адчуваю жыццё на ўсе 100 працэнтаў!**

Некаторыя з сяброў Дар'і ў сацыяльных сетках, якія сочаць за яе актыўным жыццём і замежнымі вандроўкамі, думаюць, што яна шмат зарабляе. І вельмі здзіўляюцца, калі даведваюцца, што тая працуе настаўніцай.

— Большая палова маіх паездак за мяжу — прафесійныя. Ты пішаш якую-небудзь навуковую работу ці матывацыйны ліст, каб прыняць удзел у міжнародных праграмах, семінарах ці школах. Трэба толькі не ленавацца, пад ляжачы камень вада не цячэ, — тлумачыць педагог. — Напрыклад, я даўно займаюся вывучэннем Халакосту. Цяпер захапілася медыяадукацыяй. Кожнае лета ўдзельнічаю ў гістарычнай вуснай экспедыцыі: мы збіраем успаміны сведак тых ці іншых падзей, запісваем іх на відэа, якое потым захоўваецца ў Беларускім архіве вуснай гісторыі. Усё робіцца выключна на валанцёрскіх умовах, але ж гэта страшэнна цікава. Сёлета, напрыклад, збіралі ўспаміны остарбайтараў і беларусаў, якія знаходзіліся на акупаванай тэрыторыі. І мае вучні, дарэчы, часта карыстаюцца пры падрыхтоўцы да ўрокаў сайтам архіва вуснай гісторыі.

Па-за школай наведваю, напэўна, мільён мерапрыемстваў. Адпачынак у гамаку на дачы — гэта на маё. У Мінску кожны вечар арганізуюцца сустрэчы з цікавымі людзьмі, бясплатныя лекцыі, майстар-класы, выстаўкі, канцэрты... Асабліва шмат мерапрыемстваў для гісторыкаў — матэматыкам і хімікам з гэтым пашанцавала менш (*смяецца.* — **Аўт.**). Сям'я, зразумела, таксама патрабуе ўвагі. Але можна сумясціць свае інтарэсы і абавязкі ды пайсці на цікавае мерапрыемства разам са сваімі роднымі.

Для Дар'і Касяковай прафесія настаўніка — найлепшы спосаб для самарэалізацыі. Выбіраючы паміж высокааплатнай працай і працай, якая прыносіць задавальненне, яна робіць выбар на карысць апошняй.

— Не ведаю, як складзецца далей жыццё, але пакуль я магу дазволіць сабе такую раскошу, як любімая работа, — дадае яна. — Упэўнена, што кожнае новае пакаленне лепшае за папярэдняе, хоць многія кажуць, што цяперашнія вучні не чытаюць, што ім нічога не цікава. А я лічу, што яны нашмат разумнейшыя за нас, і ў іх ёсць менавіта тыя навыкі, якія патрабуюцца ў сучасным свеце. Дзяцей нельга навучыць — настаўнік можа толькі паказаць ім усе магчымасці. Няма людзей, якія не хочуць даведвацца штосьці новае, але шмат таго, што захоўваецца ў нашай школе, на жаль, ужо атавізм. Усё, што дзеці вучаць, павінна быць для іх актуальным!

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

***(Поўны тэкст і фота шукайце на нашым сайце www.zviazda.by).***



алімпіец
ЗВЯЗДА
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

# «АДЧУЙ БУДУЧЫНЮ»

## Пад такім дэвізам сёння стартуюць III Юнацкія Алімпійскія гульні

**Наша каманда адправілася ў Аргенціну яшчэ ў сераду, у яе склад увайшлі 37 спартсменаў і 18 трэнераў. Беларускія атлеты выступяць у 16 відах спорту: акрабатыка, барацьба, спартыўная гімнастыка, мастацкая гімнастыка, веславанне на байдарках і каноэ, акадэмічнае веславанне, дзюдо, лёгкая атлетыка, сучаснае пяцібор'е, стральба з лука, кулявая стральба, тэніс, настольны тэніс, парусны спорт, плаванне і скачкі на батуце.**



Сярод галоўных прэтэндэнтаў на медалі ў Буэнас-Айрэсе плыўчыха Анастасія Шкурдай, якая ўжо не раз падымалася на п'едэсталы міжнародных спаборніцтваў, гімнастка Ганна Каменшчыкава, скакун на батуце Іван Літвіновіч, лёгкаатлеты Аляксей Александровіч і Ганна Зубкова.

На провадах каманды **першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Андрэй Асташэвіч** зачытаў удзельнікам спаборніцтваў пажаданні **кіраўніка дзяржавы, прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандра Лукашэнкі.** *«Памятайце, абараняць спартыўную славу Беларусі — вялікі гонар. Перакананы, што вы пацвердзіце высокі ўзровень айчыннай сістэмы падрыхтоўкі атлетаў і годна прадставіце сваю Радзіму на юнацкіх Алімпійскіх гульнях у Аргенціне».* Прэзідэнт НАК выказаў надзею, што Гульні шырока расчыняць перад маладымі беларускімі атлетамі дзверы ў спорце найвышэйшых дасягненняў і стануць яркім пачаткам кар'еры.

III летнія юнацкія Алімпійскія гульні пройдуць у Буэнас-Айрэсе, гэта ўсяго другі выпадак пасля Рыа-2016, калі паўднёваамерыканскі горад прымае спаборніцтвы такога маштабу. Адзначым, што ў Аргенціне з'явяцца новаўвядзенні, якіх няма на дарослых Алімпіядах. Напрыклад, лёгкая атлетыка будзе прадстаўлена ў незвычайным фармаце: за выключэннем кросу на 4000 метраў, у астатніх дысцыплінах не будзе фінальных раўндаў. Пераможцы і прызёры ў бегу, скачках і кіданні будуць вызначаныя па выніках дзвюх спроб.

Пасля працяглага перапынку ў алімпійскую праграму вяртаецца крос. Апошні раз спаборніцтвы па бегу па перасечанай мясцовасці праводзіліся на Алімпійскіх гульнях у 1924 годзе ў Парыжы. Лёгкаатлеты, якія спецыялізуюцца на дыстанцыях 1500, 2000 і 3000 метраў, пасля завяршэння сваёй асноўнай праграмы прабягуць крос, які вызначыць медалістаў.

У гімнастыцы пройдзе новае комплекснае каманднае спаборніцтва, у якім будуць удзельнічаць спартсмены з усіх чатырох гімнастычных дысцыплін: акрабатыкі, спартыўнай і мастацкай гімнастыкі, скачках на батуце.

У парусным спорце дэбютуе кайтсёрфінг. Удзельнікам трэба будзе зрабіць два заплывы, па выніках якіх найлепшыя кваліфікуюцца ў фінал.

Хакей на траве будзе прадстаўлены ў Буэнас-Айрэсе больш кароткай, але дынамічнай версіяй, вядомай як Hockey5s. Аналагічным чынам футбол заменены на футзал. Замест 40-хвілінных таймаў і 11 спартсменаў, якія гулялі на адкрытым паветры, як гэта было ў Сінгапуры і Нанкіне, каманды будуць праводзіць 20-хвілінныя таймы ў камандах з пяці чалавек у закрытым памяшканні. Гандбол, між тым, рухаецца ў іншы бок з увядзеннем пляжнай версіі, усе гульні пройдуць на пяску. Веласіпедысты змогуць выступіць у трох дысцыплінах: крытэрыуме, гонцы на 60 кіламетраў і індывідуальнай гонцы з раздзельным стартам. Гэта дазволіць ім набраць як мага больш ачкоў для сваёй каманды.

Таксама ўпершыню пройдуць спаборніцтвы па BMX-фрыстайле, якія ўжо ўвайшлі ў праграму Гульняў-2020 у Токіа.

## Аб беларускім спорце — у Нью-Ёрку

**Фотавыстаўка «Быць чэмпіёнам: гісторыя вялікіх перамог», прысвечаная беларускаму спорту і ўкладу краіны ў алімпійскі рух, на гэтым тыдні праходзіць у штаб-кватэры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Нью-Ёрку.**

У цырымоніі адкрыцця экспазіцыі прыняў удзел кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Беларусі Уладзімір Макей. Выстаўка арганізавана напярэдадні II Еўрапейскіх гульняў, якія ў наступным годзе пройдуць у Мінску. Таму на мерапрыемстве таксама быў дадзены старт маштабнай міжнароднай прэзентацыі гэтай спартыўнай падзеі.

Святаслаў ДРАНІЦКІ:

# «КАЛІ ДУМАЮ ПРА МЕДАЛІ, АХІЛЫ РВУЦЦА»

## Што перашкаджае нашым гімнастам перамагаць? Чэмпіён Еўропы расказвае пра старыя залы і сур'ёзныя траўмы

**Пасля гучных перамог Віталя Шчэрбы і Івана Іванкова беларуская спартыўная гімнастыка адышла ў цень. Сярод сусветных лідараў — японцаў, кітайцаў, амерыканцаў, расіян — мы вельмі рэдка чуем беларускія прозвішчы, але ўсё ж такое здараецца. На цяперашнім чэмпіянаце Еўропы ў Глазга нарэшце прагучаў і беларускі гімн, малады спартсмен Святаслаў Драніцкі стаў пераможцам у апорным скачку. Дарэчы, апошні раз нашы юніёры перамагалі на чэмпіянаце кантынента ажно ў 2002 годзе, тады «золата» заваяваў Аляксей Ігнатовіч.**

**Пасля чэмпіянату Еўропы Святаслаў павінен быў пачаць падрыхтоўку да чэмпіянату свету, але праз два тыдні пасля перамогі яго напаткала няўдача: на спаборніцтвах у Грузіі Драніцкі атрымаў сур'ёзную траўму і з-за гэтага не здолеў змагацца за пападанне на мундзіяль, які пройдзе ў гэтым месяцы. Мы сустрэліся са спартсменам, каб абмеркаваць цяперашнюю сітуацыю ў спартыўнай гімнастыцы, успомнілі Віталя Шчэрбу і трэнера Івана Іванкова.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

***— Святаслаў, вы прыйшлі ў гімнастыку, калі эра вядомых беларусаў ужо скончылася, значных вынікаў нашы спартсмены не дасягалі.***

— Там быў невялікі перапынак, нашы хлопцы сталі чэмпіёнамі свету ў камандзе ў 2001 годзе, а я пачаў займацца спартыўнай гімнастыкай у 2005-м. Не магу сказаць, што нешта канкрэтнае прыцягнула мяне ў гэтым відзе спорту. Прывялі бацькі, у мяне атрымлівалася, мне падабалася, было жаданне хадзіць на трэніроўкі, таму і застаўся.

***— Адсутнасць вынікаў у нашых спартсменаў зараз спісваюць на дрэнныя ўмовы. Якія залы і трэнеры былі ў вашым дзяцінстве?***

— Мяне прывялі ў гімнастыку ў пяць гадоў, у залу «Кольцы славы» каля стадыёна «Трактар». У гэтай самай зале я трэніруюся і сёння, праз трынаццаць гадоў. Наогул, памяшканню, па-мойму, ужо 45 гадоў. Вядома, умовы далёкія ад ідэальных, можна сказаць старажытныя, напрыклад няма дывана. Але ў нас жа ёсць база ў Стайках, мы ездзім туды на зборы, там умовы добрыя. У «Кольцах славы» нічога новага вучыць не спрабуем, гэта небяспечна. Каб пазбегнуць траўмаў у асноўным навучанне ідзе ў Стайках, на «Трактары» толькі адпрацоўваем элементы, даводзім да аўтаматызму ўжо вывучанае.

Што датычыцца трэнераў, не магу сказаць, што яны ў нас у Беларусі дрэнныя ці не кваліфікаваныя. Усе настаўнікі, з якімі я працаваў, вельмі падабаліся. Першым трэнерам была жанчына, яна выкладала харэаграфію, набірала дзяцей з садка і ўзяла мяне да сябе. У першы ж год я пачаў выйграваць спаборніцтвы, можа быць, дарэчы, з-за гэтага і захацеў застацца ў спорце. Перайшоў у групу, вышэйшую па ўзроўні, потым трэніраваўся ў настаўніка Івана Іванкова Юрыя Сцяпанавіча Коваля. Дарэчы, яму ўжо хутка будзе 80, але ён і цяпер трэніруе. З вялікай павагай да яго ставіўся, вельмі дасведчаны трэнер, рады, што займаўся ў яго. Менавіта Юрый Сцяпанавіч і заклаў у мяне асноўную базу, асновы гімнастыкі. Ён любіць пагаварыць, таму часта расказваў і пра Івана, прыводзіў нам, тады яшчэ дзецям, яго ў прыклад.

***— Кажуць, найлепшыя трэнерскія кадры з'ехалі за мяжу...***

— Не магу так сказаць. Хто з'ехаў, той з'ехаў, не хачу даваць ацэнку, асуджаць. Гэта выбар кожнага.



***— Колькі дзяцей тады было ў вашай групе?***

— Шмат, колькі дакладна, не памятаю, але толькі два чалавекі перайшлі ў наступную групу, і яны ж засталіся ў вялікім спорце, гэта я і Рома Антропаў.

***— Што вы памятаеце з дзяцінства? Што тады казалі пра таго ж Шчэрбу ці Іванкова?***

— Казалі, што яны зрабілі нешта добрае, але я гэтага не разумеў — кажуць і кажуць. Потым, калі пачаў разумець, што яны заваёўвалі медалі Алімпійскіх гульняў і чэмпіянатаў свету, стаў думаць пра гэта. Але тады для мяне прыкладам былі ўсё ж такі не яны, а старэйшыя хлопцы, якія трэніраваліся ў нас у зале, заўсёды глядзеў за імі і проста хацеў дагнаць.

***— Наколькі сёння беларуская гімнастыка вядомая ў свеце?***

— Думаю, яна наогул не вядомая. Зразумела, аматары спорту ва ўсім свеце памятаюць Шчэрбу, але не больш за тое. На юніёрскім узроўні мы выступаем добра, таму нас ведаюць. Калі браць дарослую каманду, яна шмат «падае», пакуль у нас няма стабільнасці. Зараз хлопцы набралі вялікую складанасць, таму цяжка. Калі з'явіцца стабільнасць, у камандных спаборніцтвах мы спакойна можам наблізіцца да п'едэстала. У асабістых выступленнях таксама ёсць нядрэнныя хлопцы: Павел Булаўскі, які выйграваў этапы Кубка свету, Андрэй Ліхавіцкі.

***— Вы займаецеся ў зале, дзе трэніруюцца і дзіцячыя групы, цяпер у гімнастыцы шмат дзяцей?***

— Не, большасць бацькоў выбіраюць спартыўную гімнастыку толькі як базавы від спорту, таму што гэта вельмі добра для развіцця. Гэта значыць, яны прыводзяць дзяцей, а потым забіраюць, каб аддаць у футбол, хакей і гэтак далей. Ёсць, вядома, бацькі, якія хочуць вадзіць на заняткі і далей, але дзіця не хоча. Можа, дзецям не падабаецца, таму што гэта цяжкі від спорту. Многіх палохаюць траўмы. Хоць кажуць, што гімнастыка — адзін з самых бяспечных відаў спорту, а, напрыклад, футбол па статыстыцы нашмат небяспечнейшы.

***— Ці згодны з гэтым?***

— Канешне, не!

***— А вас траўмы не палохалі?***

— Было такое, што я наогул баяўся нешта рабіць у зале, вучыць элементы. А потым трэнеры проста прымушалі, дапамагалі і страх праходзіў. Цяпер вось парваў ахіл, у гэтым годзе ламаў яшчэ палец, спіцы ўстаўлялі. Пераломы гэта звычайная справа.

***— Што здарылася з ахілам?***

— Праз два тыдні пасля чэмпіянату Еўропы паехалі на спаборніцтвы ў Грузію, здаваў там камбінацыю, і ён чагосьці адарваўся. Цяпер трэба будзе два месяцы хадзіць у гіпсе, потым аднаўляцца. Калі доўга адпачываеш, цяжка пачаць штосьці рабіць, трэнерам даводзіцца падштурхоўваць, а потым як-небудзь прыйдзеш у залу і пачынае атрымлівацца, думаеш: «О, яшчэ зраблю!» Потым яшчэ, і так успамінаеш, усё вяртаецца. Знаходзячыся ў гіпсе, усё роўна хаджу ў залу, мацую тыя мышцы, якія магу, каб захаваць форму і па магчымасці адразу прыступіць да трэніровак.

**«Мяне прывялі ў гімнастыку ў пяць гадоў, у залу «Кольцы славы» каля стадыёна «Трактар».**

***— «Золата» чэмпіянату Еўропы для вас было нечаканым?***

— Я заўсёды различваю на тое, што траплю ў фіналы, а там ужо як пойдзе. Думкі пра ўзнагароды, вядома, заўсёды ёсць, але ніколі іх не планую, таму што, калі пачынаю думаць пра медалі, вось ахілы рвуцца ці яшчэ што-небудзь здараецца. Апошнія гады два проста імкнуся трапіць у фінал, каб зрабіць там сваё, паказаць усё, на што здольны.

***— Любімыя практыкаванні ў вас ёсць?***

— Не, а вось нелюбімыя ёсць — гэта конь-махі. З дзяцінства яны ў мяне не атрымліваюцца.

***— У сусветных лідарах у спартыўнай гімнастыцы сёння японцы, кітайцы, амерыканцы, расіяне. У чым іх сакрэт?***

— Да сённяшняга дня праблемы з электраэнергіяй у вас узнікалі? — Звяраючыся з раздрукаваным на лазерным прынтары дэталёвым планам станцыі, інспектар накіраваўся ў лабараторны модуль.

— Ніводнага разу, — начальнік станцыі пакорліва пайшоў за інспектарам, для чаго Свірыду прыйшлося набрацца смеласці. — Усё працавала лепш за швейцарскі гадзіннік. Да Хлуда ў гэтых адносінах прэтэнзій ніколі не было.

— У вас ёсць здагадкі пра тое, што магло стаць прычынай спынення падачы электраэнергіі да знешніх гермадзвярэй? — Па дарозе інспектар па прафесійнай звычцы аглядаў абстаноўку.

— Ніякіх, спадар Сарва. Электраэнергія проста раптам знікла, а аварыйная падача пачалася толькі праз пяць ці шэсць секундаў. Можа, больш.

— А павінна была ўключыцца адразу, — інспектар нахмурыўся. Гэтых самых пяці альбо шасці секундаў аказалася больш чым дастаткова: розніца ціску ўнутры «Сымона Марыя» і на паверхні Ганімеда не пакінула навукоўцам ніводнага шанцу ацалець. — Ці ўдалося высветліць, з якой прычыны не спрацаваў аварыйны стопар гермадзвярэй?

— Ён якраз і спрацаваў, — гора ціснула на начальніка станцыі ўсё мацней. Мяркуючы па ўсім, зносін з псіхатэрапеўтам у найбліжэйшыя тыдні, а то і месяцы, яму не пазбегнуць, — але паветра высмактала з такой сілай, што гермадзверы спыніліся толькі на трэцім кроку... Для нармальнага функцыянавання «Сымона Марыя» даводзіцца падтрымліваць сілу цяжару, роўную зямной.

— Што за дзіўная планіроўка? Гермадзверы ў лабараторным модулі? Навошта?

— З-за недахопу карысных плошчаў мы выкарыстоўваем... то-бок выкарыстоўвалі ў якасці дадатковай лабараторыі грузавы шлюз.

— А які характар работ на станцыі? — Інспектар не заўважыў ні адной камеры відэаназірання.

— Мы праводзім эксперыменты з фарсіраваным вымарожваннем вады з ільдоў і яе апрасненнем: масавая доля вадзянога лёду на Ганімедзе ляжыць у інтэрвале ад сарака шасці да пяцідзесяці працэнтаў. Больш чым сур'ёзная база для тэрафарміравання.

— Вопыты паспяховыя?

— Вельмі перспектыўныя... Пастойце, спадар Сарва! Вы падазраяце, што хтосьці спецыяльна адключыў падачу электраэнергіі? — Ад лішку пачуццяў начальнік станцыі схапіў інспектара за руку і развярнуў да сабе.

— Выключаць такі варыянт нельга, — інспектар мякка вызваліўся з захопу. — Мяркую, што фарсіраваным вымарожваннем і апрасненнем займаецеся не толькі вы адны?

— Працэс адкрывае вельмі шырокія перспектывы, як я ўжо казаў...

— ...і абяцае нядрэнны прыбытак?

— Не без гэтага... — пацвердзіў начальнік станцыі і дазволіў сабе выказаць сумненне ў магчымасці прамысловага шпіянажу: — Калі б нехта пракраўся на станцыю, мы б даведаліся пра гэта.

— Замок на гермадзвярах электрамагнітны або электрамеханічны? — Не стаў дэманстраваць скепсіс інспектар. Знешнія камеры відэаназірання былі, аднак наўрад ці акажацца так ужо і складана ўсталяваць над імі дыстанцыйны кантроль.

— Электрамагнітны.

— Скажыце, спадар Свірыд, станцыйныя камп'ютары маюць выхад у Старнэт? — На ўнутраных створках бачных пашкоджанняў не было.

— Зразумела, спадар Сарва. Але там некалькі ступеняў абароны ад узлому.

Інспектар павярнуў крэмальерную зашчапку. Мужчыны ўвайшлі ў грузавую шлюзавую камеру. Унутры панаваў хаос: усё, што не было замацавана, высцілала керамабетонавую падлогу суцэльным дыванам.

Дастаткова было аднаго погляду для таго, каб зразумець, што клеткай Фарадэя лабараторыя не з'яўляецца. Так што знешняе ўздзеянне не выключалася.

— Нічога падазронага вакол «Сымона Марыя» ў апошні час не адзначалі? — Інспектар выцягнуў з чамаданчыка са следчым інструментарыем магутную лупу і прыступіў да агляду знешніх створак.

— А што падазронае мы павінны былі запрыкмеціць? — Пытанне збіла начальніка станцыі з панталыку.

— Дроны, exempli gratia.

— Мы спецыяльна не сочым за наваколлем, спадар Сарва, — вінавата развёў рукамі начальнік станцыі. — Працы хапае і без назірання. Але калі гэта настолькі важна, то мы можам паглядзець відэазапісы. Яны ў нас па годзе захоўваюцца.

— Абавязкова паглядзім.

Кабелі энергападачы мацаваліся непасрэдна да пераборкі, і інспектар павольна пайшоў уздоўж сцяны, разглядаючы іх у моцную лупу. Праз некалькі крокаў спыніўся і дастаў газавы храматограф, пасля чаго павёў па кабелі сілікагелевым алоўкам. Лёд.

— Зараз задзейнічана сістэма аварыйнага асвятлення?

— Так, спадар Сарва. Маіх ведаў для рамонту базавай, на жаль, не хапае.

— Паверхневай вадой вы карыстаецеся?

— Выключна для тэхнічных патрэб. Апрасняльна-ачышчальная ўстаноўка дазваляе абыходзіцца ўласнымі запасамі.

Інспектар кіўнуў і схаваў газавы храматограф. Погляд рушыў па сцяне і столі ў пошуках працёку. Наткнуўся на сумешчаны з тэрмометрам электронны гадзіннік, які паказваў няправільны час. Паветра ў памяшканні прагрэлася да плюсавой тэмпературы.

Начальнік станцыі нервова праглынуў, калі інспектар схіліўся над трупамі. Усе прыкметы паказвалі на тое, што Багін, Кабеліс і Хлуд загінулі ад выбуховай дэкампрэсіі. Ад целаў ішоў рэзкі пах ваніт, мачы і фекаліяў. Гіпаксія і механічныя траўмы рабілі трупы падобнымі на марыянеткі з абарванымі ніткамі. Навукоўцы нічога не паспелі зрабіць дзеля ўласнага выратавання.

Інспектар зрабіў некалькі фотаздымкаў загінулых з розных ракурсаў і папрасіў:

— Раскажыце, калі ласка, што тут адбылося, спадар Свірыд.

— З чаго пачаць? — Начальнік станцыі разгубіўся.

— Ab ovo... Прашу прабачэння. Пачніце з таго моманту, як вы накіраваліся ў туалет.

— Добра... — Начальнік станцыі зрабіў некалькі глыбокіх удыхаў. На мерцвякоў пры гэтым стараўся не глядзець. — Туалет у грузавым шлюзе не прадугледжаны, таму я пайшоў у той, каторы ў сектары В. Ён найбліжэйшы. Ля самых дзвярэй раптам выключылася святло... Я пачуў лямант і пабег назад. Адчыніў гермадзверы, а ўнутры...

Начальнік станцыі не стрымаў слёз. Інспектар цярпліва дачакаўся, калі Свірыд здолее працягнуць.

— Я спрабаваў ім дапамагчы, спадар Сарва. Клянуся вам, спрабаваў, але яны ўсе былі мёртвыя... Потым я пабег у радыёрубку і выклікаў дапамогу... Ведалі б вы, спадар Сарва, чаго мне каштавалі гэтыя чатыры гадзіны! Я ледзь не звар'яцеў.

— Для вас гэта было б аптымальным выхадам, спадар Свірыд.

— Як вас разумець? — Начальнік станцыі асалапеў.

— Не было ніякага пазаштатнага адключэння электраэнергіі. Спадароў Багіна, Кабеліса і Хлуда забілі вы.

— Ды як вы можаце? — Начальнік станцыі пачырванеў, калі зразумеў, што сказанае — зусім не жарт. — Я не пацярплю брудных інсінуацый у свой адрас! З гэтымі людзьмі я з'еў не адзін пуд солі!

— Жадаеце доказаў, спадар Свірыд?.. Воля ваша. Час на электронным гадзінніку ў лабараторыі адстае ад сярэднезямнога не на пяць-шэсць секундаў, як вы казалі, а на цэлыя тры хвіліны. Ста васьмідзесяці секундаў гарантавана хопіць для таго, каб чалавек замерз і задыхнуўся: гермадзверы — цяжкія, зачыніць іх уручную немагчыма. Толькі пры дапамозе ручнога прывада. Працэс гэты — працяглы. Зацягнецца яшчэ больш, калі застапарыць гермадзверы лёдам... З тым каб выклікаць абястачванне і не дазволіць Багіну, Кабелісу і Хлуду зачыніць гермадзверы, вы выкарысталі мадыфікаваную полівад. У лабараторыі ўжо даўно цяпло, а лёд на кабелі энергападачы да гэтага часу так і не растаў. Як і на сервапрывадзе гермадзвярэй.

— Калі вы не ў курсе, спадар Сарва, на Ганімедзе сярэдняя паверхневая тэмпература — сто дзесяць градусаў Кельвіна. Мінус сто шэсцьдзясят тры градусы па Цэльсію, — нагадаў начальнік станцыі.

— Лёд, па-за залежнасцю ад фазы, не можа раставаць, не пакідаючы знаку. Працёку нідзе няма, няма ніякіх падстаў для ссядання кандэнсату ў адным-адзінюткім месцы, з чаго я раблю выснову, што мадыфікаваная полівада аказалася на кабелі энергападачы і ў сервапрывадзе зусім не выпадкова... Полівада згуляла з вамі злы жарт, спадар Свірыд. Дазволіўшы расправіцца з падначаленымі, яна не пакінула магчымасці замесці сляды: гэта — не звычайная вада, якую дастаткова змахнуць рукой ці выцерці анучай.

— Якое выключнае трызненне! Каб я, доктар тэхнічных навук, прафесар, апусціўся да пахабнага забойства? — Начальнік станцыі ўспыхнуў, абураны да глыбіні душы. І без пераходу кінуўся на інспектара, імгненна страціўшы журботны выгляд. На костках правай рукі ў святле люмінесцэнтных лямпаў бліснуў метал.

Quod erat demonstrandum.

Напад не застаў інспектара знянацку: Сарва зрушыўся і адпрацаваным на шматлікіх трэніроўках па самаабароне прыёмам паклаў начальніка станцыі тварам у падлогу. А затым сашчапіў заведзеныя за спіну рукі забойцы аднаразовай пластыкавай сцяжкай:

— Вы маеце права захоўваць маўчанне...

Начальнік станцыі лаяўся і з усіх сіл спрабаваў вызваліцца, пакуль інспектар зачытваў яму «правіла Міранды» і абшукваў. Іншай зброі, акрамя металічнага ланцужка для мультытула, у злачынцы не знайшлося.

— А цяпер, спадар Свірыд, прызнавайцеся, што прымусіла вас пайсці на жорсткае забойства?.. Знайшлі ў лёдзе нешта звышкаштоўнае? Альбо вырашылі валодаць сакрэтам вымарожвання аднаасобна?

Начальнік станцыі толькі лаяўся. Падняцца яму замінала далонь інспектара. Сарва ніколі і не падумаў бы, што чалавек ва ўзросце і з акадэмічнай знешнасцю валодае гэтакім велізарным запасам абсцэннай лексікі. Любы крымінальнік абзайздросціцца.

Выдыхнуўшыся, Свірыд змірыўся з паражэннем і праз нейкі час, рыпнуўшы зубамі, пакаяўся:

— Так, спадар Сарва, я забіў. «Aqua Inc.», бельгійская карпарацыя з ліку нашых канкурэнтаў, прапанавала мне велізарныя грошы за тое, каб даведацца пра сакрэт фарсіраванага вымарожвання. Непрыстойна велізарныя. Такі шанц выпадае толькі адзін раз у жыцці. Адмаўляцца ад яго было б верхам ідыятызму...

Сарва адчуў небяспеку шостым пачуццём. Ныруў на падлогу за імгненне да таго, як ледзяная іголка, без сумненняў зробленая з мадыфікаванай полівады, утыркнулася ў пластыкавую шафу. Прабіць керамабетон яна не змагла. З расчыненых дзверцаў пырснулі аскепкі і пасыпаліся абрэзкі паперы.

Нейракамп'ютарны інтэрфейс.

Як інакш начальнік станцыі мог кіраваць мадыфікаванай полівадой?

Свірыд не пакінуў інспектару выбару: Сарва пальцамі націснуў на сонную кропку на галаве начальніка станцыі, і той абмяк.

K@нтыненты

# У БАГДАДЗЕ НЕСПАКОЙНА

## Чаму «штарміць» Ірак?



**На мінулым тыдні ў Іраку забілі каралеву прыгажосці. Пераможцу конкурсу «Міс Багдад» 22-гадовую Тару Фарэс з трыма агнястрэльнымі раненнямі знайшлі ў яе прыпаркаваным спорткары. Жанчыну давезлі да бальніцы, аднак выратаваць яе не ўдалося. Тара Фарэс вяла старонку ў «Інстаграме», дзе за яе жыццём сачылі 2,7 мільёна падпісчыкаў. Некаторыя з іх крытыкавалі прыгажуню за занадта «заходнія» здымкі, якія яна выстаўляла. Яе прыхільнікі ўпэўненыя: жанчыну застрэлілі радыкальна настроеныя мусульмане, а прычынай забойства сталі яе адкрытае адзенне і раскаванасць у зносінах. Independent адзначае, што Тара Фарэс пайшла з жыцця праз некалькі дзён пасля гібелі праваабаронцы Суад Аль-Алі, якую таксама застрэлілі ва ўласным аўто ў Басры. А ў ліпені мінулага года ахвярай радыкалаў стаў Карар Нушы. Студэнт Інстытута мастацтваў, іракскі акцёр і мадэль памёр ад нажавых раненняў. Паведамлялася таксама, што на яго целе былі знойдзены сляды катаванняў. Вядома, гэта далёка не поўны пералік крывавай хвалі гвалту, якая захліснула старажытную краіну. Калі дадаць працяглую палітычную нестабільнасць, то сітуацыя насамрэч падаецца ледзь не патавай. Што ж адбываецца ў Іраку?**

### КАЛЫСКА ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Гэтыя мясціны — калыска сусветнай цывілізацыі. Урадлівая вобласць Месапатаміі ў даліне Тыгра і Еўфрата стала адным з першых месцаў яе зараджэння. Нават сціслае пералічэнне гістарычных фактаў выглядае як захапляльны трылер. Спачатку тут з'явіліся шумерскія гарады-дзяржавы (Ур, Урук (назва якога ўласна і трансфармавалася пазней у Ірак), Вавілон), затым сюды мігравалі семіцкія плямёны, правадыр аднаго з якіх стварае легендарную акадскую імперыю. Паступова цэнтрам старажытнай Месапатаміі стаў Вавілон. У I тысячагоддзі да н. э. на гэтай тэрыторыі ўзнікла Асірыя з цэнтрам у Ніневіі. Пануючай мовай у той час з'яўлялася арамейская.



Пасля гібелі Асірыі гегемонія перайшла да халдзеяў. Персідскі цар Кір II Вялікі заваёўвае Вавілон і ўключае Месапатамію ў склад сваёй дзяржавы, якую пасля пакарыў падчас грандыёзнага заваявальнага паходу Аляксандр Македонскі. Пасля ўлада над гэтымі землямі пераходзіць элііністычнай дзяржаве Селеўкідаў. У II стагоддзі да н. э. Месапатамія была захоплена парфянамі, а затым войскамі Траяна, у выніку чаго з'явілася рымская правінцыя Месапатамія. У III стагоддзі рымлян адсюль выціскаюць сасаніды.

Арабы пачынаюць пранікаць на тэрыторыю Ірака яшчэ ў перыяд позняй антычнасці. У 636 годзе халіф Умар канчаткова заваёўвае Месапатамію, прынёсшы сюды іслам. Першымі арабскімі цэнтрамі сталі гарады Эль-Куфа і Басра. Пры халіфе Алі краіна ператвараецца ў арэну грамадзянскай вайны, гэта час з'яўлення тут шыітаў, якія цяпер складаюць рэлігійную большасць Ірака. У 762 годзе халіф Ал-Мансур будуе Багдад і робіць яго сталіцай Арабскага халіфата. Найбольшага росквіту гэтая дзяржава дасягнула пры Харуне ар-Рашыдзе, чый вобраз быў адлюстраваны ў кнізе «Тысяча і адна ноч». Падзенне халіфата прыходзіць разам з уварваннем манголаў у 1258 годзе, калі Багдад быў разбураны, а халіф забіты.

Пасля мангольскага нашэсця Ірак уваходзіць у дзяржаву Хулагуідаў, паступова ўзмацняецца цюркскі элемент. У 1534 годзе тэрыторыя Месапатаміі была заваявана туркамі-асманамі і знаходзілася ў складзе Асманскай імперыі. У 1914-м брытанскія войскі ўварваліся на поўдзень Ірака. Да 1918-га яны ўзялі пад кантроль амаль усю краіну. Незалежнасць Ірака ад Вялікабрытаніі абвешчана ў 1932 годзе. У 1958-м была ўтворана адзіная Арабская Федэрацыя з Каралеўствам Іарданія. 14 ліпеня таго ж года ў выніку змовы афіцэраў і рэвалюцыі былі забітыя кароль, рэгент і прэм'ер-міністр краіны, манархія знішчана, Ірак абвешчаны рэспублікай. Камандзір брыгады генерал Абдэль Керым Касем стаў кіраўніком новага рэжыму. Арабская Федэрацыя распадаецца. У 1979 годзе прэзідэнтам Ірака становіцца Садам Хусейн аль-Маджыд ат-Тыкрыці. Пад яго кіраўніцтвам была праведзена маштабная мадэрнізацыя краіны. У выніку гэтых пераўтварэнняў ужо ў пачатку 1980-х Ірак стаў адной з найбольш развітых дзяржаў арабскага свету.

### ПАСЛЯ САДАМА

Сілы міжнароднай кааліцыі (асноўныя ўдзельнікі — ЗША і Вялікабрытанія) у сакавіку 2003 года без мандата Савета Бяспекі ААН уварваліся ў Ірак. Аперацыя «Іракская свабода» пачалася на падставе пошуку зброі масавага паражэння (ЗМП) і прывяла да звяржэння рэжыму Садама Хусейна і Партыі арабскага сацыялістычнага адраджэння («Баас»). Пазней інспектары ААН і амерыканскія вайскоўцы прыйшлі да высновы, што на момант пачатку ваеннай аперацыі Багдад не меў праграмы стварэння ЗМП, а Хусейн — сувязяў з «Аль-Каідай», у чым яго абвінавачвалі ў ЗША. Адметна, што гэтыя дзеянні днямі рашуча асудзіў Дональд Трамп. «Дзень, калі мы накіраваліся на Блізкі Усход, стаў самым дрэнным для нашай дзяржавы», — адзначыў цяперашні гаспадар Белага дома. Дарэчы, паводле асобных падлікаў, Штаты выдаткавалі на Блізкі Усход сем трыльёнаў долараў.

Між тым, як адзначаюць эксперты, у 2000-я Ірак уступіў у перыяд грамадзянскіх войнаў. Сітуацыя ўскладнялася тым, што на тэрыторыі краіны атабарыліся баевікі «Ісламскай дзяржавы». Фарміраванні ІД акупавалі частку іракскай тэрыторыі летам 2014-га. У чэрвені таго ж года яны захапілі другі па велічыні горад краіны Масул (адміністрацыйны цэнтр правінцыі Найнава) і абвясцілі яго сталіцай «халіфата». У 2015-м пры падтрымцы міжнароднай кааліцыі іракскія ўрадавыя сілы пачалі шырокамаштабную кампанію па вызваленні захопленых тэрарыстамі раёнаў. Летась у снежні прэм'ер-міністр Ірака Хейдар аль-Абадзі абвясціў аб канчатковай перамозе над ІД у краіне.

Як заўважаюць эксперты, нягледзячы на абяцанні амерыканцаў выкараніць тэрарызм і пабудаваць «свабодную нацыю», сёння гэтая блізкаўсходняя дзяржава па-ранейшаму пакутуе ад экстрэмізму і гвалту, эканамічнага адставання і слабасці дзяржаўных інстытутаў. Ваеннае ўварванне, грамадзянская вайна і тэрарызм прывялі да гібелі сотняў тысяч грамадзян. Па некаторых падліках, толькі ваенныя дзеянні с 2003-га па 2011 год забралі жыцці амаль паўмільёна іракцаў. З-за канфлікту мільёны людзей пакінулі сваё жыллё, папоўніўшы ў тым ліку шэрагі бежанцаў, якія рухаюцца на захад.

### НАФТАВЫ «РЭБУС»

Ірак — трэці ў свеце экспарцёр нафты, які саступае толькі Саудаўскай Аравіі і Расіі. Краіна здабывае 4,3 мільёна бараляў у дзень, з якіх прыкладна 4 мільёны ідуць на экспарт. Пры цяперашніх расцэнках на «чорнае золата» краіна павінна штодня атрымліваць 340 мільёнаў долараў. Амерыканцы спадзяваліся, што за кошт нафтавай выручкі Ірак зможа хутка аднавіцца пасля вайны і ператварыцца ў багатую дзяржаву накшталт Кувейта або Саудаўскай Аравіі. Але гэтага не адбылося з-за палітычных і сацыяльных узрушэнняў.

Паводле ацэнкі ААН, 99 працэнтаў дзяржаўных даходаў Ірака генеруецца нафтавым сектарам. Дзякуючы яму фінансуецца работа ўрадавых органаў, абаронны сектар, інфраструктурныя праекты. У гэтым сектары заняты ўсяго адзін працэнт насельніцтва краіны. Як заўважаюць эксперты, з-за карупцыі нафтавыя даходы размяркоўваюцца вельмі вузкай праслойкай іракскага насельніцтва.

Новая канстытуцыя 2005 года абвясціла Ірак дэмакратычнай федэратыўнай парламенцкай рэспублікай, зацвердзіла ўвядзенне аўтаномнага кіравання на поўначы і поўдні краіны, а таксама пераразмеркавала ўладу. На пасаду прэм'ер-міністра абіраецца прадстаўнік шыітаў, на пасаду прэзідэнта краіны — курдаў, на пасаду спікера парламента — сунітаў. Але нягледзячы на рэформы і спробы дэмакратызацыі, дзяржаўны апарат па гэты дзень застаецца паралізаваным з-за карупцыі (Ірак займае 169-е са 180 месцаў у рэйтынгу Transparency International) і бюракратыі (з часоў Садама Хусейна колькасць дзяржслужачых вырасла з 1 мільёна да 7 мільёнаў чалавек).



### НОВАЯ ГЛАВА?

Ірак адкрыў новую главу ў сваёй гісторыі і пачаў перыяд аднаўлення пасля вызвалення ад тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава». Пра гэта заявіў міністр замежных спраў Ірака Ібрагім аль-Джаафар, выступаючы нядаўна на 73-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. «Наша краіна паступова адыходзіць ад вайны з тэрарызмам і рыхтуецца да новага этапу — этапу аднаўлення і рэканструкцыі, вяртання пакінутых бежанцаў у іх домы, умацавання дзяржаўных інстытутаў, — сказаў ён. — Ваенная перамога над тэрорам не азначае яго канчатковага знішчэння, мы імкнёмся ліквідаваць прычыны яго ўзнікнення».

Сёлета ў лютым у Кувейце прайшла міжнародная канферэнцыя па аднаўленні Ірака. У ёй узялі ўдзел прадстаўнікі сусветнага бізнесу, гуманітарных арганізацый, ААН, Сусветнага банка і дзясяткаў дзяржаў. У прыватнасці, Еўрапейскі саюз абвясціў аб выдзяленні 400 мільёнаў долараў у якасці гуманітарнай дапамогі. Сусветны банк вырашыў выдаткаваць 4,7 мільярда долараў, Кувейт — 2 мільярды, Турцыя — 5 мільярдаў, Саудаўская Аравія — 1,5 мільярда долараў. Усяго ўдзельнікі канферэнцыі абавязаліся ўкласці ў рэабілітацыю эканомікі пасляваеннага Ірака ўнушальную суму — каля 30 мільярдаў долараў.

Кажучы аб аднаўленні пацярпелых ад ІД раёнаў, аль-Джаафар падчас выступлення на сесіі Генасамблеі ААН зноў заклікаў іх «выканаць дадзеныя абяцанні і абавязацельствы». «Наш урад працуе над перадоленнем эканамічнага крызісу з дапамогай наладжвання эканамічнага партнёрства, стварэння спрыяльнага інвестыцыйнага клімату для забеспячэння стабільнага росту і развіцця эканомікі Ірака», — дадаў дыпламат.

Днямі прэзідэнт Ірака Бархім Салех (быў абраны ў аўторак новым складам парламента пад кіраўніцтвам спікера Мухамеда аль-Хальбусі, былога губернатара правінцыі Анбар) вылучыў Адэля Абдэля Махдзі (колішняга міністра нафты) кандыдатам у прэм'еры і даручыў яму сфарміраваць новы ўрад рэспублікі. Махдзі атрымаў падтрымку найбуйнейшых палітычных аб'яднанняў, якія прайшлі ў парламент. У іх ліку альянс «Саірун» шыіцкага багаслова Муктады ас-Садра, які перамог сёлета на майскіх выбарах, а таксама «Фатх» камандзіра шыіцкага апалчэння Хадзі аль-Аміры. У адпаведнасці з канстытуцыяй, у Махдзі ёсць 30 дзён, каб вылучыць кандыдатуры міністраў і прадставіць іх у парламент на зацвярджэнне. Здаецца, у палітычным жыцці шматпакутнага Ірака з'яўляюцца прыкметы стабілізацыі. Вядома, новаму кабінету трэба адбудоўваць краіну пасля трохгадовай вайны з джыхадзістамі і лавіраваць паміж галоўнымі саюзнікамі: Іранам і ЗША, якія ў адносінах паміж сабой з'яўляюцца геапалітычнымі праціўнікамі. «Калі іракцы загінуць, яны зноў падымуцца», — казаў некалі Садам Хусейн. Вельмі хацелася б, каб атрымалася менавіта так.

**Захар БУРАК.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 36 (432)

На сцэне

# Опера, эксперыменты і беларуская драматургія

## Хутка тэатральная сфера вызначыць свае наймацнейшыя бакі

**Мы пачалі шлях да вызначэння лаўрэатаў Нацыянальнай тэатральнай прэміі, якія будуць абвешчаны 21 снежня. Музычныя, лялечныя, эксперыментальныя спектаклі і не толькі будуць прадстаўлены ў адмысловых секцыях і ў шэрагу намінацый змогуць стаць найлепшымі. З 2 кастрычніка на мінскіх пляцоўках паказваюцца найцікавейшыя, па версіі адборачнай камісіі, пастаноўкі, створаныя ў беларускіх тэатрах за апошні год. З гэтых намінантаў некалькі складаў журы павінны будуць вызначыць пераможцаў. За спаборніцтвам, адпаведна, могуць сачыць і гледачы: расклад паказаў можна знайсці на сайце Купалаўскага тэатра, які з'яўляецца выканаўчай дырэкцыяй конкурсу.**

Міжнародны форум тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ» толькі-толькі завяршыў паказ праграмы «Belarus open», якая прадстаўляе свой пункт гледжання на тое, што ў беларускіх тэатрах варта ўвагі, а мы ўжо маем магчымасць пазнаёміцца з новай падборкай, дзякуючы свайму фармату нават шырэйшай. Пяты Рэспубліканскі конкурс тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» арганізуецца Міністэрствам культуры і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам, гэта значыць нейкім чынам транслюе цікавасць дзяржавы да тэатра і яго падтрымку. Прыемна, што дыплом і статуэтка лаўрэатам прадугледжваюць і грашовы прыз.

Конкурс павінен вызначыць пераможцаў у секцыях музычных тэатраў, тэатра лялек, тэатраў драмы, кожная з якіх уключае ў сябе некалькі намінацый, эксперыментальных спектакляў, а таксама знайсці найлепшы спектакль на твор сучаснага беларускага аўтара і найлепшы спектакль для дзяцей і юнацтва.

Упершыню, напрыклад, Нацыянальная тэатральная прэмія выдзяляе эксперыментальныя спектаклі ў асобную секцыю. «Тое, што сёння з'яўляецца эксперыментам і смелым прарывам, заўтра можа стаць класікай», — каментуе **першы намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА**. Пакуль незразумела, па якіх крытэрыях секцыя ўвабрала ў сябе свае спектаклі, але ўвайшло сюды чатыры работы — «Бетон» і «Сёстры Граі» Яўгена Карняга, «ДэкаДанс/Арыгамі» Вольгі Скварцовай, «Oedipus» Юры Дзівакова.

Сярод намінаваных на прэмію ёсць і тыя спектаклі, што належаць прыватным тэатрам. Зразумела, са сваімі праектамі — а ўсяго на ўдзел у першым адборачным туры было пададзена 87 заявак, з якіх адабрана 48 пастановак, — выступаюць Вялікі тэатр оперы і балета, Беларускі дзяржаўны тэатр лялек, Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр, Магілёўскі абласны драматычны тэатр ці Гомельскі дзяржаўны тэатр лялек. Але таксама і тэатр Генадзя Гладкова «Тэрыторыя мюзікла» (на конкурсе ён прадстаўлены спектаклямі «Недалёка ад нормы» і «Жарсці па Цілю»), Цэнтр выканальніцкіх і візуальных мастацтваў «Арт Карпарэйшн» з іх праектам «Опіум» Аляксандра Марчанкі, тэатральны праект «ТрыТфармаТ» з пастаноўкай «Шлюбны дагавор».

Яшчэ адной навінкай стала намінацыя «Найлепшы спектакль тэатра драмы малой формы». Апроч яе, у секцыі тэатраў драмы пастаноўкі змогуць прэтэндаваць на званне «Найлепшага спектакля тэатра драмы», свае перамогі атрымаюць найлепшыя рэжысёр, сцэнограф, выканальнікі мужчынскай і жаночай роляў. Гэтая секцыя ўвогуле адна з самых «густанаселеных», бо ўвабрала ў сябе 22 пастаноўкі, сярод якіх як «Рэвізор», скажам так, мэтра Мікалая Пінігіна, так і «Чалавек з Падольска» маладога рэжысёра Дзмітрыя Багаслаўскага.

У секцыі музычных тэатраў за ўзнагароды будуць змагацца тры тэатры і дзевяць пастановак. Чатыры ад Вялікага — «Багема», «Тоска», «Ор і Ора», «Каханне і смерць». Тры ад акадэмічнага музычнага — «Трыстан і Ізольда», «Вясёлая ўдава», «Вішнёвы сад». І дзве ўжо названыя ад «Тэрыторыі мюзікла».

Лялечны тэатр — адзін з самых цікавых у беларускім тэатральным асяроддзі ўвогуле — пакажа сем прэтэндэнтаў на званне «найлепшага спектакля тэатра лялек», а таксама зможа вызначыць зноў жа найлепшага рэжысёра, сцэнографа, выканальнікаў мужчынскай і жаночай роляў. Крыху дзіўна, што сярод намінантаў няма работ Аляксея Ляляўскага, але Беларускі дзяржаўны тэатр лялек тут ёсць: у выглядзе «Каляднай гісторыі» Ігара Казакова і «Пансіёна Belvedere» італьянскага рэжысёра Матэа Сп'яцы. Ёсць і пастаноўкі ўжо вядомых імёнаў — Яўгена Карняга, Аляксандра Янушкевіча, Юры Дзівакова.

Асобна будзе ўзнагароджаны «Найлепшы спектакль па творы сучаснага беларускага аўтара», і на гэты прыз намінаваныя «Час сэканд-хэнд» паводле Святланы Алексіевіч, «Радзіва Прудок» паводле нядаўняга бестселера Андруся Горвата і «Дарожка мая» Аляксандра Козака — усяго шэсць спектакляў.

Усе намінаваныя на Нацыянальную тэатральную прэмію пастаноўкі маюць быць паказаны да 21 снежня, а на адмысловай урачыстай цырымоніі атрымаць — ці не атрымаць — свае ўзнагароды. Конкурс сапраўды інтрыгуе: часам нават сам адбор падаецца дзіўным, таму з уласнай згодай і нязгодай спаборніцтва спектакляў набывае даволі гарачы характар.

Білеты можна набыць у касах тэатраў, а таксама на сайце kupalauski.by.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ.**

Сустрэчы

# ПРА ШТО МАЎЧАЛА КРЫТЫК АРЛОВА

**Гэта ўзаемна: у беларускага тэатра ёсць крытык Таццяна Арлова, у жыцці крытыка Арловай ёсць беларускі тэатр. Апошняе — справа, у якую ўмяшаўся лёс. Таму што яна, прыехаўшы з Масквы ў Мінск паступаць на журфак, не проста тут засталася, а здолела ўвайсці ў беларускі тэатральны мікракосмас і ўплываць на яго праз сваё меркаванне. Разбірала на атамы, выводзіла заканамернасці і прапаноўвала формулы, каб з аднаго рэчыва сінтэзаваць новае ці некалькі новых. І здолела дасягнуць таго, што падаецца неверагодным для любога крытыка наогул: яе любіць тэатр. Як адзначыў галоўны рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага Сяргей Кавальчык, заўсёды хацелася сачыць, пра што напісала крытык Арлова і пра што яна прамаўчала.**



Яе любяць у тэатры, і не толькі ў Купалаўскім, дзе адбылася сустрэча-размова з прафесарам Таццянай Арловай пра жыццё і мастацтва. Яна сабрала залу! Не будучы пазнавальнай праз тэлебачанне актрысай, рэжысёрам ці імпрэсарыа (прадзюсарам) з сусветным імем. Але гэта як паглядзець. Таму што ў той час, калі Таццяна Арлова пачынала пісаць пра тэатр, крытык павінен быў быць па ведах і мысленні на ўзроўні рэжысёра, яго праца фактычна была роўнай па задачах з працай тэатральнага імпрэсарыа. А наконт актрысы... Будучы дачкой вядомага артыста і тэатральнага выкладчыка Дзмітрыя Арлова, так ці інакш была паглыблена ў таямніцы гэтай прафесіі.

І дакладна — заўсёды ўмела сябе трымаць належным чынам перад вялікай аўдыторыяй (не дадуць схлусіць былыя студэнты журфака, што прайшлі журналісцкую школу Арловай), і заўсёды было цікава: што ж пра тую ці іншую прафесійную з'яву скажа Арлова? Як яна гэта скажа?

Дагэтуль цікавяцца. На сустрэчы ў тэатры імя Янкі Купалы зала камернай сцэны была паўнюткая. Людзі тэатра (рэжысёры, акцёры, крытыкі), журналісты (па культуры, грамадстве ці спорце). І абавязкова — студэнты. Яе студэнты — не былыя, а заўсёдныя. Прыйшлі на чарговую лекцыю Арловай. Якую яна правяла на адным дыханні. На гэты раз расказвала пра жыццё, уласнае.

### ТЭАТР

— Мне прыемна, што гэта адбываецца ў тэатры імя Янкі Купалы. Гэта дарагое для мяне месца, яшчэ з пасляваеннага часу, калі мы, дзеці акцёраў, гулялі ў вайну і будавалі штабы, — гаворыць Таццяна Арлова. — Мой штаб быў пабудаваны на пажарнай лесвіцы гэтага будынка. Цяпер там шкляны пад'ёмнік. Каб замаскіравацца і лепш схавацца, мы збіралі розныя рэчы, афішы спектакляў. Вось у такім антуражы мы гулялі...

Мая першая кніжачка «Ты і я» была не толькі пра тэатр, а яшчэ і пра кіно. Першую свядомую кніжку «Купалаўцы» я напісала, калі была маладая, пра тых акцёраў, якіх ведала і любіла. Цяпер у мяне гатовая больш істотная работа, якая мае папярэднюю назву «Друзей моих прекрасные черты».

Адным з купалаўцаў быў мой муж, Яўген Шабан. У гэтым тэатры ён працаваў загадчыкам літаратурнай часткі, тут ішлі яго п'есы.

Для мяне тэатр — гэта душа, думкі, учынкі чалавека. Ён у цэнтры. Пра яго гаворка.

### ЖУРНАЛІСТЫКА

— Гэта не толькі тэхналогіі, як часам нам здаецца. Увогуле, гэта таксама чалавек у яго думках, пачуццях і ўчынках.

Калі я расказвала пра тэатр і вучыла студэнтаў пісаць рэцэнзіі, я была абсалютна ўпэўнена, што той, хто ўмее напісаць рэцэнзію, здолее стварыць любы журналісцкі матэрыял.

Доктарскую дысертацыю я абараніла, увёўшы ў навуковы зварот тэрмін «тэатральная журналістыка». Даказала, што такая была, ёсць і будзе. Тэатразнаўцы і сур'ёзныя крытыкі скептычна ставяцца да гэтай з'явы. Тэатральную журналістыку ствараюць усе журналісты, якія пішуць пра тэатр. І яна таксама будзе існаваць вельмі доўга. Як тэатр, як асобы ў ім. Як людзі, пра якіх расказваюць на мовах розных мастацтваў.

Ёй хочацца гаварыць пра тое, што яна ведае. І, магчыма, да тых кніг, што належаць аўтарству прафесара Таццяны Арловай, дададуцца новыя, ужо створаныя, што чакаюць выхаду ў свет і яшчэ не напісаныя. Але тут затрымкі не будзе — такая ў яе прафесія.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Прыгожае жыццё

# Па адзежы сустракаюць

**Айчынныя дызайнеры распрацавалі вобразы для прадстаўніцы Беларусі на «Міс Свету».**



Фота БелТА.

У Нацыянальнай школе прыгажосці дызайнеры паказалі ўборы, у якіх беларуска Марыя Васілевіч прадставіць нашу краіну на міжнародным конкурсе «Міс Свету — 2018». Нагадаем, сёлета гэты самы прэстыжны форум прыгажунь са 117 краін стартуе ўжо 10 лістапада ў кітайскім горадзе Санья, а завершыцца 8 снежня шоу гранд-фіналу.

Адным з самых відовішчных у конкурсе па традыцыі з'яўляецца дэфіле ў нацыянальных касцюмах. Сваё бачанне Беларусі сучаснай прадставіла дызайнер Дар'я Мугака, якая спалучыла вобраз «сувенірнай лялькі» з традыцыйнымі колерамі і матэрыяламі, што выкарыстоўваюцца ў нацыянальных беларускіх касцюмах. Сукенка-трансформер, што называецца, лёгкім узмахам рукі ператвараецца з бальнага максі-ўбору ў эфектнае міні. Як зазначыла сама беларуская канкурсантка, гэты момант вельмі важны, бо ў сукенцы трэба будзе не толькі прыгожа прайсці па подыуме, але і выканаць нацыянальны танец.

Над вячэрняй сукенкай, якую Марыя «выгуляе» ў намінацыі «Міс топ-мадэль», працавала каманда дызайнераў з вядомага айчыннага дома моды. З чорнай тафты і цюлю майстры, падкрэсліваючы зграбную постаць дзяўчыны, зрабілі нешта бліскуча-эфемернае, накшталт трапічнага матылька, і разам з тым дастаткова арыгінальнае і яркае, каб беларуская ўдзельніца не згубілася на вялікай сцэне. Калі арыгінальнасць творчай задумы і вобраз наогул уразяць міжнароднае журы належным чынам, Марыя Васілевіч мае шанцы перамагчы ў гэтай намінацыі і аўтаматычна трапіць у топ-40 удзельніц фіналу «Міс Свету».

А вось замест трэцяй сукенкі для фінальнага шоу яе аўтар, беларуская дызайнер Юлія Латушкіна, паказала пакуль што толькі эскіз з «паветраным» сілуэтам і пераліўчатую тканіну складанага колеру з пераходам ад сіняга да бірузы.

Зразумела, убораў у багажы «Міс Беларусь» будзе значна больш: канкурсанткі знаходзяцца ў Кітаі на працягу цэлага месяца і ўвесь гэты час актыўна ўдзельнічаюць у дабрачынных, спартыўных, культурна-адукацыйных і забаўляльных мерапрыемствах, афіцыйных сустрэчах, фотасесіях і відэаздымках. І канешне, акрамя прыгожай абалонкі, дзяўчына актыўна працуе над зместам: шмат займаецца з выкладчыкамі Нацыянальнай школы прыгажосці харэаграфіяй і дэфіле і не забываецца на ўрокі англійскай мовы.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# Шляхамі паэта

**Міжнароднае свята паэзіі «О, Навагрудскі край — мой родны дом...», прысвечанае 220-годдзю з дня нараджэння Адама Міцкевіча, праходзіць у Навагрудку 5–7 кастрычніка, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле культуры Навагрудскага райвыканкама.**

Як вядома, дзіцячыя і юнацкія гады паэта прайшлі на Наваградчыне. У старажытным горадзе часта праходзяць розныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да знакавых дат жыцця Адама Міцкевіча. Нямала цікавых падзей і сустрэч падрыхтавана для гараджан і гасцей з нагоды і гэтага свята.

Напрыклад, 5 кастрычніка прайшла навукова-практычная канферэнцыя з удзелам гісторыкаў, філолагаў, супрацоўнікаў музеяў, культуролагаў і іншых спецыялістаў, навуковыя інтарэсы якіх звязаны з рознымі аспектамі міцкевічазнаўства і актуалізацыі спадчыны паэта. У гэты дзень у Навагрудку адкрыўся новы дзіцячы садок, побач з якім закладзена алея памяці Адама Міцкевіча.

Асноўныя святочныя мерапрыемствы разгорнуцца 6 кастрычніка. У праграме — выступленні вядучых творчых калектываў рэгіёна і краіны, а таксама шоу пясочнай анімацыі па матывах паэмы «Пан Тадэвуш». Адкрыецца музей пад адкрытым небам «Страчаная спадчына» з макетамі розных гістарычных аб'ектаў. Фіналам дня стане вогненна-піратэхнічнае шоу і опэн-эйр «Прысвячэнне Песняру». Гасцей чакаюць квэсты і займальныя экскурсіі, адкрыюцца пленэр і выстаўка работ юных мастакоў.

Завершыцца свята 7 кастрычніка велапрабегам «Шляхам Міцкевіча». Усім ахвотным прапануюць пераадолець дыстанцыю ў 20 кіламетраў паміж Навагрудкам і возерам Свіцязь, апетым паэтам.

Кінакрокі

# ЗОМБІ-АПАКАЛІПСІС НА ВІДЭАРЭГІСТРАТАРЫ

## На вялікім экране паказалі фільм, цалкам складзены з дарожных здарэнняў

**Кіно — адна з самых цудоўных маніпуляцый. Яшчэ цудоўней назіраць, якія формы гэтая маніпуляцыя часам набывае. У час, калі ў кінасферы не проста з'яўляюцца, а ў свае правы ўступаюць ненаратыўныя эксперыменты, фільмы, знятыя на схаваную ці вэб-камеру, кампіляцыі фотаздымкаў і іншае, на вялікім экране ў Мінску паказалі дакументальную карціну «Дарога» Дзмітрыя Калашнікава. Фільм цалкам складзены з запісаў відэарэгістратараў, дзе работа рэжысёра, здаецца, заключаецца ў выбарцы і мантажы. Так, нехта зрабіў калекцыю відэа, склаў гэта ў нейкую адпаведную задуме чарговасць, і выдаў за кіно. І паказаў, што гэта можа быць вартым кінатэатра, а не толькі канала на YouTube.**

Праект беларускага прадзюсара Волі Чайкоўскай і расійскага рэжысёра пакатаўся па цэлым шэрагу кінафестываляў, ад расійскага «Артдокфэсту» да нідэрландскай «IDFA», з'ездзіў у Фінляндыю, Канаду, Польшчу, Эстонію, ЗША са сloганам «Усё, што заўгодна, можа здарыцца на расійскіх дарогах». Са слоганам і кур'ёзным кірункам, у якім паказваецца насамрэч не толькі расійская, але, скажам, рускамоўная прастора, праект, здаецца, добра «зайшоў» замежнай публіцы, бо ўпісаўся ў тамтэйшую дэманізацыю Расіі, якая часам значна дапамагае кінааўтарам прыцягваць да сябе ўвагу. Скажам так, Андрэй Звягінцаў добры не толькі сваім тонкім, атмасферным і шчырым кіно, але і тым, што трапляе ў кан'юнктуру.

З дарогі і гурта «Троіца» тут усё пачынаецца, дарогай і канчаецца. Увесь фільм складаецца з эпізодаў розных часоў, гарадоў і значэнняў, і ад кожнага ты ў выніку пачынаеш чакаць нейкага здарэння, непрадбачанага для тых, хто знаходзіцца ў аўтамабілі, і вельмі жаданага для цябе. Аварыі, жывёлы, Чалябінскі метэарыт і іншыя пагодныя катаклізмы, раз'юшаныя людзі і бойкі паказваюцца пад акампанемент каментарыяў і не даюць спыніцца. Як толькі пачынаецца новы эпізод, ты ведаеш, што кіроўца знаходзіцца ў пэўнай небяспецы і горача жадаеш дазнацца, у чым яна заключаецца на гэты раз.

> **Такое скажэнне колераў, адчуванне сусветнай катастрофы і інтрыга не заўсёды сустракаюцца і ў ігравым кіно. Зомбі-апакаліпсіс запісалі на відэарэгістратар.**

У гэтым сэнсе «Дарога» — вельмі маніпулятыўны фільм. Мы ўсё яшчэ знаходзімся ў сферы кіно, якому ўласціва выклікаць суперажыванне, хваляванне, спачуванне, але падчас прагляду на першы план выступаюць іншыя пачуцці. Мы сапраўды чакаем новых здарэнняў і казусаў, незалежна ад таго, нясе гэта ў рэальным жыцці небяспеку, калецтвы і смерці, гэта значыць замяняем чалавечыя пачуцці на прагу новых узрушэнняў. Натуральна, пераваroты машын, стрэлы, палаючы лес задавальняюць глядацкую цікавасць і праз гэта не адпускаюць ад экрана: перастаць глядзець, што яшчэ можа здарыцца на дарогах, немагчыма. Пэўным індыкатарам тут выступаюць больш дынамічныя ўстаўкі, у якіх кароткія вытрымкі з запісаў відэарэгістратараў змантаваны пад драйвовую ці нейкую яшчэ музыку.



Калі бачыш аварыі пад песню «Аўкцыёна», нешта ўсё ж падаецца ненармальным — ці гэта іронія над гледачом, які «з'ядае» жудаснае відовішча пад дынамічныя біты, ці шчырае жаданне паказаць дарожныя здарэнні як цалкам натуральныя інцыдэнты, бо на гэтай прасторы, маўляў, інакш быць не можа. Фокус у тым, што і глядач перастае ўспрымаць аварыі як аварыі, а глядзіць на гэта як на нейкі партрэт вось такой кур'ёзнай рэальнасці. Маўляў, паміраюць людзі — што зробіш, гэта расійскія дарогі.

Што цікава, дакументальны фільм, дзе аўтар нават не прыклаў руку да здымак і распараджаўся толькі правам выбару і мантажом, часам выглядае вельмі кінематаграфічна. Што толькі пацвярджае інтэграцыю законаў кіно ў рэальнае жыццё ці наадварот. Тут ёсць дзіўны эпізод: машына з пасажырамі, што, канешне, актыўна каменціруюць і выказваюць эмоцыі, праязджае праз палаючы лес. На краі дарогі гарыць іншая машына. Кіроўца рухаецца павольна. Такое скажэнне колераў, адчуванне сусветнай катастрофы і інтрыга не заўсёды сустракаюцца і ў ігравым кіно. Зомбі-апакаліпсіс запісалі на відэарэгістратар.

> **Аказалася, мы вельмі проста пераключаемся з дарогі як страшнай з'явы на дарогу як крыніцу жартаў. Фільм Дзмітрыя Калашнікава ў гэтым сэнсе больш вылучаецца сваімі эксперыментамі над гледачом, чым створанымі сэнсамі.**

Часам сярод такога роду відэа, аказваецца, сустракаюцца сюжэтныя эпізоды. На адной вытрымцы дзяўчына кінула свае сумкі ў машыну, а кіроўца з'ехаў. Яна папрасіла ўладальніка відэарэгістратара, што стаяў за імі, паехаць за тым аўтамабілем, бо гэта таксіст. Яны дагналі таксі, забралі сумкі з дакументамі, а скончылася ўсё знаёмствам «Я Паша» — «Я Даша».

Карціна ахапіла шмат характэрных рэчаў: спосаб вырашаць канфлікты — саступаць дарогу павінен той, у каго няма молата; спосаб рамантаваць дарогі — закідваць месіва ў лужыну; спосаб пакутаваць — выбягаць басанож на дарогу перад машынай, садзіцца на капот, а потым перабягаць па яе даху. Мядзведзя на дарозе і коней з санямі, якія наехалі на аўтамабіль. Танкі і клінінг-сэрвіс для іх. Хлопца, што скраў каўбасу з машыны. Дзяўчыну, якая вучылася кіраваць і пераехала праз усю дарогу, знесла агароджы, бо пераблытала педалі.

Не менш важнай часткай фільма з'яўляецца не толькі тое, што адбываецца перад лабавым шклом, але і падзеі ўнутры аўтамабіля. Каментарыі, нецэнзурныя словы, якія ўвесь час уплятаюцца ў гаворку, «заі», упамінанне Бога, спосаб камунікаваць, манера гаварыць, цеплыня паміж сваякамі і іх духоўнае яднанне пасля катастрофы, што здарылася перад вачыма, нерухомасць, калі маладыя людзі збіваюць кіроўцу іншай машыны, — усё таксама складваецца ў пэўны калектыўны партрэт. Не кажучы ўжо пра тое, што жывыя эмоцыі становяцца важнай часткай нашага ўспрымання фільма і таго, што ён дэманструе.

> **Як толькі пачынаецца новы эпізод, ты ведаеш, што кіроўца знаходзіцца ў пэўнай небяспецы і горача жадаеш дазнацца, у чым яна заключаецца на гэты раз.**

«Дарога», што скарысталася запісамі відэарэгістратараў, паказала пошук новых фармаў і шляхоў сучасным кінематографам і паспрабавала праз сваю ідэю адлюстраваць пэўную прастору. Кур'ёзна і маніпулятыўна. Аказалася, мы вельмі проста пераключаемся з дарогі як страшнай з'явы на дарогу як крыніцу жартаў. Фільм Дзмітрыя Калашнікава ў гэтым сэнсе больш вылучаецца сваімі эксперыментамі над гледачом, чым створанымі сэнсамі. Прынамсі, эксперымент паказаў цікавы вынік.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

## Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2.
Телефон для справок: 120

Данная отчетность опубликована
на сайте ОАО «Белгазпромбанк» www.belgazprombank.by
в разделе «Финансовые показатели»

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
### на 1 октября 2018 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 87 106 | 70 203 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 546 | 630 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 169 281 | 202 688 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 302 468 | 445 903 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 810 067 | 956 368 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 2 598 421 | 2 405 359 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 291 | 947 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 665 | 572 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 171 187 | 177 511 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 295 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 7 976 | 9 638 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 25 816 | 32 850 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **4 174 119** | **4 302 669** |
| | | | | | |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 1 011 126 | 709 278 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 2 519 330 | 2 986 759 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 131 205 | 77 640 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 11 331 | 137 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 18 108 | 32 360 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 3 691 100 | 3 806 174 |
| | | | | | |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 189 357 | 189 357 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 52 350 | 46 300 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 19 709 | 25 278 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 221 603 | 235 560 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 483 019 | 496 495 |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **4 174 119** | **4 302 669** |

### ОТЧЕТ
### О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
### на 1 октября 2018 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 217 076 | 218 605 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 98 032 | 99 730 |
| 3 | *Чистые процентные доходы* | 201 | | 119 044 | 118 875 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 73 567 | 44 853 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 18 568 | 9 443 |
| 6 | *Чистые комиссионные доходы* | 202 | | 54 999 | 35 410 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 6 033 | (928) |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (1 453) | 49 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 37 470 | 36 535 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (19 452) | (201) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 11 491 | 33 963 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 11 981 | 8 350 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 119 939 | 108 636 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 5 923 | 5 381 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 71 269 | 50 110 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 17 494 | 5 354 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **53 775** | **44 756** |

Заместитель председатель правления А.П. Ильясюк

Главный бухгалтер Н.М. Дылевская

Дата подписания: 3 октября 2018 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 выдана
Национальным банком Республики Беларусь 24.05.2013. УНП 100429079

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на 3 (три) года имущества, принадлежащего РУП «Белоруснефть-Минскавтозаправка»

**Лот № 1. Право заключения договора аренды Объекта. Состав, краткая характеристика Объекта:** 1. Часть здания станции диагностики легковых автомобилей и микроавтобусов (СТО-38-на АЗС-39) с инвентарным номером 600/С-65897. Площадь, сдаваемая в аренду – 32,6 кв. м. 2. Часть благоустройства, входящего в состав капитального строения с инвентарным номером 600/С-65897 площадью 70 кв. м. 3. 13 единиц оборудования: – тележка гидравлическая (инв. № 5913); – борторасширитель S-275 (инв. №5914); – стенд балансировочный для грузовых и легковых колес СБМП-200 (инв. №5934); – стенд балансировочный «Мастер» СБМП-60/3D (инв. № 5935); – шиномонтажный стенд автомат TRUCKER для монтажа колес груз. а/м Ш515Е (инв. № 5936); – шиномонтажный стенд автомат. ОМА 672А для монтажа колес легковых а/м (инв. № 5937); – комплект для легковых колес для стенда балансировочного СБМП 200 (инв. № 5952); – инфлятор IFL-27 (инв. № 5954); – вулканизатор Дуплекс (инв. № 5955); – прибор для углубления протектора PS15 standart (инв. № 6657); – подъемник YAK 215N-30/15t, CAYAK-215N (инв. № 6807); – электрический гайковерт 1 MaxBoxer (инв. № 7100); – верстак слесарный (инв. № 2926). Местонахождение Объекта: Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, 11 км. автодороги Минск – Гродно (лево). Срок договора аренды: 3 (три) года. **Начальная цена Лота № 1, с учетом НДС 20 % – 413,23 бел. руб. Сумма задатка – 41,32 бел. руб. Шаг аукциона: 5 %.**

**Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта**: – за часть здания станции диагностики легковых автомобилей и микроавтобусов (СТО-38-на АЗС-39) с инвентарным номером 600/С-65897 площадью 32,6 кв. м – 722,39 (семьсот двадцать два белорусских рубля 39 копеек), в том числе НДС 20 % – 120,40 (сто двадцать белорусских рублей 40 копеек); – за часть благоустройства, входящего в состав капитального строения с инвентарным номером 600/С-65897 площадью 70 кв. м – 45,5 базовых арендных величин, в т. ч. НДС 20 %; – за 13 единиц оборудования – 235,84 (двести тридцать пять белорусских рублей 84 копейки), в том числе НДС 20 % – 39,30 (тридцать девять белорусских рублей 30 копеек)

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести лот по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор аренды Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе лота в течение 3 (трех) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Организатору аукциона стоимость услуги Организатора аукциона и стоимость затрат на приобретение товаров, работ, услуг у сторонних организаций (индивидуальных предпринимателей) на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. Функциональное назначение Объекта – оказание услуг по ремонту шин, включая регулировку и балансировку колес, легковых и грузовых автомобилей.
5. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом». Базовая арендная величина с 01.04.2018 равна 16 руб. 11 коп. Цена продажи Лотов не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством Республики Беларусь

Размер штрафа, в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, составляет 1 000,00 белорусских рублей

**Аукцион состоится 06.11.2018 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже права заключения договора аренды (Лот №1), принадлежащего РУП «Белоруснефть-Минскавтозаправка», проводимом 06.11.2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 02.11.2018 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Дрозд Екатерина Александровна, тел. 8 (017) 279-88-43

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Центр Промышленной Оценки
**• Организация аукционов**
**• Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Трест № 26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж. Тел.: +375 17 256 90 12, +375 17 256 90 01 |

**Предмет аукциона – Лот № 1**
Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования и иного имущества, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Гродненская, 55Д/1

| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| **Склад-навес** | Сооружение специализированное складов, хранилищ | 265,4 кв. м | 100/С-45882 |
| Составные части и принадлежности: Два покрытия, ограждение, ворота | | | |
